

АБ БАЦЬКОЎСКАЙ ЛЮБОВІ І ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАДТРЫМЦЫ 3

НАРОДНАЯ ФІТАТЭРАПІЯ 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. АЎТОРАК № 201 (30081)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сям'я як асноўны элемент грамадства была і застаецца ключавым фактарам стабільнасці і развіцця любой дзяржавы, у тым ліку і нашай.*
*Не падлягае сумненню яе асаблівая роля ў захаванні культуры, чалавечых каштоўнасцяў і гістарычнай пераемнасці пакаленняў нацыі. Нам сумесна неабходна настойліва прасоўваць у грамадстве пазітыўныя адносіны да шчаслівых сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. Station Становўчы прыклад бацькоў, агульнасць інтарэсаў старэйшага і падрастаючага пакаленняў, сумеснае вырашэнне жыццёвых задач — гэта самы надзейны шлях выхавання ў сям'і з самага ранняга ўзросту годнага чалавека і грамадзяніна нашай краіны».*

# Сувораўскія чытанні



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Уладзіслаў АРЛОЎ з Докшыц і Дзяніс ЖЫЗНЕЎСКІ з Петрыкава сёлета паступілі ў Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча. Цяпер яны вучацца на 1 курсе. Хлопцы захапляюцца футболам, мараць навучыцца іграць на гітары.

Гэтае фота зроблена на ўроку беларускай літаратуры. Суворaўцы любяць чытаць. Урокі роднай літаратуры, якія праводзіць выкладчыца Наталля Буркевіч, выклікаюць у іх непадробную цікавасць.

## КОРАТКА

- Прамвытворчасць у Беларусі ў студзені — верасні вырасла на 8,1 працэнта.
- **У Беларусі намалочана 8,6 млн тон збожжа з улікам рапсу.**
- Двума энергаблокамі БелАЭС выпрацавана больш за 20 млрд кВт·гадз. электраэнергіі.
- **Таварыства «Беларусь — Узбекістан» створана ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі.**
- «Белпошта» адкрыла падпіску на першае паўгоддзе 2024 года.
- **ДАІ Мінскай вобласці 16—30 кастрычніка ўзмоцніць кантроль за перавозчыкамі пасажыраў.**

ISSN 1990 — 763X

Жыллё

## У сталіцы ўзводзіцца больш за сотню жылых дамоў

### Галоўная ўвага — шматдзетным сем'ям

**У Мінску ў стадыі будаўніцтва знаходзіцца 113 шматкватэрных жылых дамоў агульнай плошчай 1,2 мільёна квадратных метраў. Пра гэта расказала старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Ірына ГОНТАРАВА.**

СТАР. 4



Лічбавізацыя

## ІНАВАЦЫЙНЫЯ, ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ, АЙЧЫННЫЯ...

### Што сёння могуць сучасныя электронныя тэхналогіі

**Тэма лічбавізацыі вельмі значная для эканомікі любой краіны, і кірункаў для яе развіцця мноства. Айчынныя прадпрыемствы актыўна ствараюць у Беларусі шмат праектаў з выкарыстаннем самых сучасных інтэлектуальных тэхналогій, што ў будучыні прыцягне ў краіну заказчыкаў, упэўнены спецыялісты. Каб высветліць, якія прадпрыемствы паспяхова прайшлі лічбавую трансфармацыю і ўкаранілі ці стварылі найлепшыя тэхналагічныя прадукты, у нашай краіне сёлета другі раз ладзіцца конкурс «Лідары лічбавай эканомікі — 2023». Вынікі леташняга спаборніцтва ўжо паказалі, што ІТ-галіна Беларусі ўстойлівая, а кампаніі гатовы прапанаваць беларускай эканоміцы канкурэнтаздольныя і інавацыйныя прадукты і паслугі.**

### СВАЕ СПЕЦЫЯЛІСТЫ, УЛАСНЫЯ РАСПРАЦОЎКІ

Вынікі мінулага года паказалі, што конкурс добра ўпісваецца ў канцэпцыю лічбавізацыі ўсіх галін эканомікі і дзяржаўнага кіравання. У мерапрыемстве ўдзельнічала шмат дзяржпрадпрыемстваў, якія паказалі цудоўныя і канкурэнтаздольныя праекты. І журы адзначыла, наколькі ўдала ў іх упісваюцца самыя сучасныя тэхналогіі лічбавай трансфармацыі, расказала **Таццяна ТКАЛІЧ, загадчык кафедры лічбавых сістэм і тэхналогій Інстытута бізнесу БДУ, старшыня экспертнага савета конкурсу**:

— *Мы жывём не ў самы просты час, і ва ўмовах заходніх санкцый нам неабходна развіваць сваю ІТ-галіну, праводзіць лічбавую трансфармацыю галін прамысловасці, буйных прадпрыемстваў, ствараць галіновыя платформенныя рашэнні, выкарыстоўваць вопыт, напрацаваны нашымі ІТ-спецыялістамі.*

СТАР. 5

Адкрыты дыялог

# РЭГІЁНЫ МОЦНЫЯ ПРАЦАВІТЫМІ ЛЮДЗЬМІ

**Заканатворчая дзейнасць — на прыкладах з жыцця, якія хвалююць кожнага... У Гомелі будучыя медыкі з першых вуснаў даведаліся аб актуальных задачах, якія стаяць сёння перад парламентарыямі, і задалі свае пытанні. Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася са студэнтамі, выкладчыкамі і супрацоўнікамі Гомельскага медыцынскага ўніверсітэта.**



Фота БелТА.

Да пачатку сустрэчы спікер верхняй палаты парламента пазнаёмілася з навучальным цэнтрам практычнай падрыхтоўкі і сімуляцыйнага навучання. Ён быў створаны на базе ўніверсітэта амаль пяць гадоў таму. Сёння ў Гомельскі дзяржмедуніверсітэт паступаюць маладыя людзі з розных куткоў краіны, з тым ліку каб стаць дыягностамі, спецыялістамі ўльтрагукавых даследаванняў.

Як звярнула ўвагу Наталля Качанава, сёння да 70 % урачоў Гомельскай вобласці — выпускнікі Гомельскага дзяржмедуніверсітэта. Гэта базавая ўстанова, якая забяспечвае нашу краіну кваліфікаванымі спецыялістамі.

Увогуле ж, ва ўсе часы ў Беларусі сфера аховы здароўя — адзін з самых важных кірункаў сацыяльна-арыентаванай дзяржавы. У наступным годзе, адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі, запланавана выдаткаваць 11 мільярдаў рублёў менавіта на ўмацаванне і развіццё сістэмы аховы здароўя.

Падчас сустрэчы Наталля Качана звярнула ўвагу на работу над законапраектамі — вялізны пласт дзейнасці парламентарыяў. Спікер нагадала, што ў мінулым годзе наш народ падтрымаў на рэферэндуме прапанаваныя змены ў Асноўным Законе краіны.

— Сёння 92 % законаў мы адпрацавалі, да канца года плануем усе законы прывесці ў адпаведнасць з новай Канстытуцыяй, — адзначыла Наталля Качанава.

Парламентарый нагадала аб унікальных навелах Канстытуцыі Беларусі, сярод якіх законы аб Усебеларускім народным сходзе, маладзёжнай палітыцы, грамадзянскай супольнасці. Гэта тыя кірункі, якія адлюстроўваюць імкненне нашай краіны ісці сваім палітычным і грамадзянскім курсам.

Шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, Беларусь інтэлектуальная, дзяржава-партнёр — гэтыя і іншыя стабілізацыйныя задачы-асновы былі дакладна сфармуляваны на VI Усебеларускім народным сходзе.

— Вядома, трэба, каб людзі жылі і працавалі ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны, каб мы не сцягвалі ўсе працоўныя рэсурсы ў вялікія гарады, абласныя цэнтры і горад Мінск. Нам трэба развіваць усе населеныя пункты, — нагадала адну з актуальных задач Наталля Качанава. — Дзяржава ўзяла на сябе сацыяльныя абавязацельствы і выконвае іх — у выглядзе дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, пенсій, льготных крэдытаў для вырашэння жыллёвых пытанняў. Мы бачым, што дзяржава шмат робіць і будзе далей прымаць меры. Трэба разумець, што дзяржава дае асноўныя кірункі, а далей чалавек мусіць для сябе прымаць рашэнні: дзе вучыцца, як забяспечыць сям'ю, дзе жыць, працаваць. Кожны сам свой лёс выбірае, — звярнула ўвагу спікер на тое, што ад кожнага грамадзяніна на месцы ў тым ліку залежыць поспех нашай краіны.

Старшыня Савета Рэспублікі закранула і пытанне знешняй палітыкі нашай дзяржавы. Калектыў і студэнты Гомельскага медуніверсітэта, дзе вучацца прадстаўнікі самых розных краін свету, змогуць пацвердзіць, што Беларусь заўсёды выбірае сяброўскую і міралюбівую пазіцыю. Наша дзяржава вельмі ўдзячна тым краінам, якія развіваюць з ёй дружалюбныя, канструктыўныя адносіны.

— Як бы ўрады Польшчы, Латвіі, Літвы, Эстоніі ні паводзілі сябе сёння агрэсіўна ў адносінах да Беларусі, мы ніколі не скажам дрэнных слоў у адрас народаў гэтых краін. Гэта людзі, яны ведаюць, як мы жывём. Мы не закрывалі граніцы, яны прыязджалі і бачылі іншую карціну, чым ім падавалася, — нагадала спікер.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі заклікала памятаць, што наша краіна моцная адзінствам. Па словах спікера, натуральна для людзей мець розныя меркаванні, але нельга забываць, што павінен быць парадак і строгае выкананне законаў. Наталля Качанава звярнула ўвагу студэнтаў і педагогаў і на тое, што нашу краіну чакае важны палітычны перыяд — адзіны дзень галасавання.

— Захаваць суверэнітэт, як гаворыць наш Прэзідэнт, не так складана, як яго захаваць. І задача стаіць перад вышэйшымі службовымі асобамі, Саветам бяспекі, Прэзідэнтам нашай краіны і нашым народам — захаваць мір і спакой. А гэта залежыць у тым ліку ад вас. Мы павінны працаваць, каб стварыць дабрабыт не толькі для сябе, але і для сваёй краіны. Моладзь мусіць сябраваць і супрацоўнічаць, каб ведаць, якімі праблемамі жывуць тыя ці іншыя краіны, якія сёння тэндэнцыі ў развіцці нашай краіны, — заклікала спікер.

Наталля Качана звярнула ўвагу, што Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі ў тым ліку праз сучасныя сродкі сувязі, месенджары адкрыты для пытанняў і прапаноў ад насельніцтва. Спікер падзялілася, што і падобныя сустрэчы ў рэгіёнах — магчымасць з першых вуснаў ад жыхароў пачуць іх прапановы, пытанні. Таму такія сустрэчы важна праводзіць у фармаце дыялогу.

Студэнты і выкладчыкі ўніверсітэта скарысталіся магчымасцю задаць самыя розныя пытанні. Напрыклад, гомельская моладзь пацікавілася ў Наталлі Качанавай аб яе першым у жыцці галасаванні на выбарах, аб тым, як праводзіць парламентарый вольны час. Прагучалі і пытанні аб магчымасці кар'ернага росту моладзі з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, удзеле грамадскіх арганізацый ва Усебеларускім народным сходзе.

Адно з пытанняў ад студэнтаў Старшыня Савета Рэспублікі паабяцала асабіста разгледзець і прааналізаваць. Гаворка аб атрыманні льгот для паступлення на вочную форму навучання ў ВНУ для шматдзетных бацькоў. Гэта пытанне падчас сустрэчы з Наталляй Качанавай закранулі дзве студэнткі Гомельскага медуніверсітэта — мамы трох і пяці дзяцей.

Спікер верхняй палаты падчас сустрэчы пажадала студэнтам, каб на іх жыццёвым шляху сустракаліся старэйшыя калегі, таварышы, якія падказалі б і дапамаглі ў складанай сітуацыі.

Адказваючы на пытанне, што на думку Наталлі Іванаўны важна для маладога ўрача, парламентарый пажадала справядлівага і добрасумленнага стаўлення да людзей, шчырае жаданне дапамагчы і не баяцца прасіць дапамогі ў старэйшых калег.

Дарэчы, Наталля Качанава адзначыла, што ў практычы сімуляцыйнай і практычнай падрыхтоўкі будучых урачоў ёсць цікавы момант, які можна прымяняць для падрыхтоўкі дзяржслужачых, бо ім важна вучыцца працаваць з людзьмі і такім чынам праверыць свае здольнасці для работы на кіруючых пасадах.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Міжнародны вектар

# ПРЫХІЛЬНІКІ МІРАЛЮБІВЫХ І АБ'ЯДНАЎЧЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ

## У Палаце прадстаўнікоў абмеркавалі пытанні беларуска-венесуэльскага супрацоўніцтва

**Дамоўленасці па канкрэтных кірунках узаемадзеяння былі дасягнуты падчас сустрэчы Старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ з міністрам замежных спраў Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Іванам Хілем ПІНТА. Гэта першы візіт дыпламата ў нашу краіну ў новай пасадзе. Спікер ніжняй палаты парламента ўпэўнены, што работа міністра будзе садзейнічаць развіццю, паглыбленню і пашырэнню супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Венесуэлай.**



Фота БелТА.

### «БОЛЬШ АКТЫЎНА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ»

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што на працягу невялікага па маштабах гісторыі часу паміж дзвюма краінамі выбудаваны вельмі добрыя адносіны — трывалыя і дружалюбныя. Па яго словах, падмуркам найперш з'яўляюцца шчырыя і даверлівыя адносіны, якія склаліся паміж прэзідэнтамі дзяржаў.

«Час сёння няпросты, і, нягледзячы на тое, што нашымі апанентамі ствараюцца розныя перашкоды супраць сяброўства нашых краін, нашы адносіны, наша супрацоўніцтва паспяхова развіваюцца, — звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — У вашай краіне распрацавана праграма-план развіцця да 2025 года, і мы ведаем, што ў гэтым плане асаблівая роля адводзіцца Рэспубліцы Беларусь».

Кажучы аб няпростай сітуацыі ў свеце, Уладзімір Андрэйчанка лічыць, што дзвюм краінам трэба аб'ядноўвацца. «Мы бачым, як Злучаныя Штаты Амерыкі, краіны Захаду вядуць актыўнае ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы іншых суверэнных дзяржаў: праводзяць палітыку ціску, шантажу, санкцый, — канкрэтызаваў ён. — І мы бачым, што ў гэтай сітуацыі вельмі важна кіраваццa прапановай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб запуску новага міжнароднага дыялогу па пытаннях бяспекі».

Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што ўважліва азнаёміўся з выступленнем міністра замежных спраў Венесуэлы на 78-й Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Рэспубліка Беларусь, па яго словах, мае падобныя погляды па многіх пазіцыях. «Наша краіна падтрымала ініцыятыву лідара вашай дзяржавы Нікаласа Мадуры аб стварэнні Групы сяброў у абарону Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, — адзначыў спікер. — Мы заўсёды былі і будзем прыхільныя міралюбівым і аб'яднаўчым ініцыятывам. Лічым, што нам патрэбна больш актыўна выкарыстоўваць патэнцыял створанай групы на нашых міжпарламенцкіх пляцоўках, такіх як Міжпарламенцкі саюз, Рух недалучэння, Лацінаамерыканскі парламент. Што датычыцца механізмаў рэалізацыі гэтых задач, то яны ў нас маюцца і мы вітаем фарміраванне ў кастрычніку гэтага года Нацыянальнай асамблеяй Венесуэлы групы сяброўства з парламентам Рэспублікі Беларусь».

Уладзімір Андрэйчанка перадаў шчырыя словы ўдзячнасці свайму калегу — старшыні Нацыянальнай асамблеі Венесуэлы, які пасля абрання на гэтую пасаду ў ліку першых унёс прапанову аб стварэнні групы сяброўства з Беларуссю. Праграма далейшай дзейнасці будзе вызначана ў найбліжэйшы час.

### «ВЕНЕСУЭЛА І БЕЛАРУСЬ ПРЫТРЫМЛІВАЮЦЦА АДНОЛЬКАВЫХ ПРЫНЦЫПАЎ»

Як адзначыў міністр замежных спраў Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Іван Хіль Пінта, Венесуэлу і Беларусь звязвае гісторыя, няхай і нядоўгая, але напоўненая плённай працай. «За 20 гадоў інтэнсіўнай работы ўдалося дасягнуць важных вынікаў, — нагадаў ён. — З моманту сустрэчы Уга Чавеса з Аляксандрам Лукашэнкам пачалі будавацца адносіны сяброўства паміж нашымі народамі, якія на сёння непарушныя. Быў рэалізаваны шэраг сумесных праектаў у розных галінах эканомікі, прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўнічай сферы, у выніку чаго ў Венесуэле была пабудавана цэлая інфраструктура дзякуючы гэтаму супрацоўніцтву».

Міністр замежных спраў заўважыў, што краінам удалося выбудаваць дружалюбныя адносіны, зыходзячы з пэўных прынцыпаў у зменлівай бягучай геапалітычнай сітуацыі. «Венесуэла і Беларусь прытрымліваюцца аднолькавых прынцыпаў, і гэта дае магчымасць мець падобную знешнюю палітыку, — удакладніў ён. — Мы, безумоўна, падзяляем прынцыпы суверэнітэту, правы народаў на самавызначэнне, неўмяшанне ва ўнутраныя справы замежных дзяржаў. Нашы адносіны — гэта не проста падтрымка пры галасаванні ў міжнародных арганізацыях. Мы з'яўляемся сапраўднымі стратэгічнымі партнёрамі на міжнароднай арэне. І, вядома, нягледзячы на тое што ў выніку пандэміі і санкцый адносіны паміж нашымі дзяржавамі крыху пацярпелі, сёння мы знаходзімся ў адпраўным пункце, які дазволіць вярнуць іх на ранейшы ўзровень».

Бакі абмеркавалі аспекты магчымага супрацоўніцтва ў палітычнай і эканамічнай сферах. Чакаецца вялікая работа не толькі ў рамках рабочых груп па супрацоўніцтве паміж парламентамі, але і на ўсіх узроўнях.

Як паведаміў у размове з журналістамі **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу па супрацоўніцтве з парламентам Венесуэлы Сяргей КЛІШЭВІЧ**, беларуска-венесуэльскія адносіны маюць трывалы падмурак, выбудаваны ў свой час Аляксандрам Лукашэнкам і Уга Чавесам. «На базе гэтага падмурка мы можам развіваць нашы адносіны ў любой плоскасці, — дадаў дэпутат. — Размова ідзе аб перазагрузцы, яна актыўна пачалася. Нашы кампаніі аднаўляюць работу ў Венесуэле: у першую чаргу гэта будаўнічая галіна, сельская гаспадарка. Беларусь і Венесуэла з павагай адносяцца да палітыкі адна аднай, таксама ў пэўнай ступені мы з'яўляемся маякамі для ўсяго свету ў пабудове ўласнай палітыкі, заснаванай на сацыяльнай справядлівасці, і выступаем за шматпалярны свет. Мы будзем развіваць нашы адносіны ў гандлёва-эканамічнай плоскасці, нашы эканомікі ўзаемадапаўняльныя, нам ёсць што прапанаваць адно аднаму. Безумоўна, пераадолеем санкцыі і будзем працаваць на тое, каб нашы народы жылі лепш, каб наша сяброўства мацнела ва ўсіх адносінах».

**Вераніка КАНЮТА.**

Сацыяльны вектар

# КОЖНАЯ СЯМ'Я ШЧАСЛІВАЯ ПА-СВОЙМУ

## Міністр працы і сацыяльнай абароны аб бацькоўскай любові і дзяржаўнай падтрымцы

**З 14 кастрычніка, з Дня маці, пачаўся Тыдзень бацькоўскай любові. Шчаслівая сям'я — адзін з ключавых кірункаў развіцця нашай краіны. Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ у інтэрв'ю БелТА расказвае пра дэмаграфічную сітуацыю ў краіне і падтрымку сем'яў з дзецьмі.**



***— Ірына Анатольеўна, ці імкнуцца беларусы стаць бацькамі? Якая роля ў гэтым дзяржаўнай палітыкі?***

— Наша краіна, як і шэраг іншых дзяржаў, знаходзіцца ў складанай дэмаграфічнай сітуацыі. На гэта ёсць аб'ектыўныя прычыны. У актыўны дзетародны ўзрост уступіла малакалькаснае пакаленне народжаных у канцы 1990-х — пачатку 2000-х гадоў. Змяняецца стратэгія шлюбна-сямейных адносін: узрост уступлення ў шлюб павялічваецца, адпаведна павялічваецца ўзрост мацярынства і бацькоўства.

Аднак да бацькоўства наша грамадства ставіцца пазітыўна. Паводле апытання, праведзенага ў красавіку—маі 2023 года Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі, сям'я і дзеці — сярод лідзіруючых пазіцый у структуры каштоўнасцяў беларусаў. Вышэй толькі здароўе (амаль 85 %), што не менш важна.

Пры гэтым вынікі даследавання паказалі, што пры агульнай дамінантнай сярод усіх апытаных устаноўцы на двухдзетнасць крайнія пазіцыі (аднадзетнасць і шматдзетнасць) істотна залежаць ад мадэлі той сям'і, у якой выхоўваліся самі рэспандэнты (45 % лічаць для сябе аптымальным мець двух дзяцей, 22 % — адно дзіця, 11 % — траіх дзяцей, 2 % — чацвярых і больш).

Кожная трэцяя сям'я ў краіне — двухдзетная. З 2020 года мы вядзём улік шматдзетных сем'яў, што дае магчымасць гаварыць аб далейшай станоўчай дынаміцы. Колькасць шматдзетных сем'яў прадаўжае павялічвацца, сёння іх налічваецца амаль 123 тысячы.

Асноўная задача дзяржаўнай палітыкі — стварыць умовы для таго, каб у сем'ях нараджалася двое, трое і больш дзяцей. Для гэтага ў краіне забяспечваецца матэрыяльная падтрымка пры нараджэнні дзяцей, мы дапамагаем вырашаць жыллёвыя пытанні шматдзетным і маладым сем'ям з двaімі дзецьмі, развіваем інфраструктуру дзіцячых адукацыйных і медыцынскіх устаноў, пашыраем магчымасці для сумяшчэння працоўнай дзейнасці і сямейных абавязкаў, для культурнага развіцця і сямейнага адпачынку.

***— Прыярытэт развіцця краіны на пяцігодку — шчаслівая сям'я. Можа, мае сэнс на дзяржаўным узроўні даць адзнаку значнасці працы бацькоў?***

— Святкаванне Дня маці, на мой погляд, служыць магутным мабілізуючым фактарам для аб'яднання намаганняў усяго грамадства ў павышэнні прэстыжу мацярынства. Адмысловай павагай ва ўсе часы карыстаюцца годныя маці шматдзетных сямействаў. Выгадаваць, выхаваць і даць дарогу ў жыццё дзецям няпроста. А калі іх пяцёра?

Самыя лепшыя, самыя працавітыя жанчыны, якія нарадзілі і выхавалі пяцярых і больш дзяцей, узнагароджваюцца высокай дзяржаўнай узнагародай — ордэнам Маці. Такой узнагароды ўдастоены 13 370 жанчын, у тым ліку 618 узнагароджаны сёлета. Прыемным бонусам да ордэна Маці з'яўляецца грашовая выплата ў памеры пяці бюджэтаў пражытачнага мінімуму.

Але ў пытаннях гарманічнага развіцця дзяцей, забеспячэння стабільнасці сямейных адносін вельмі важная роля не толькі маці, але і бацькі. Калі мама дае дзіцяці пяшчоту, ласку, цяпло, то тата забяспечвае абарону і ўпэўненасць, дапамагае вызначыцца з жыццёвымі прыярытэтамі, дзеліцца мудрымі жыццёвымі парадамі. Нярэдка ўзорам для пераймання дзіцяці становіцца менавіта бацька. Дзеці неўсвядомлена капіруюць яго найлепшыя якасці, яго паводзіны, стаўленне да жыцця. Таму святкаванне Дня бацькі — яшчэ адна нагода для многіх дзяцей сказаць, як моцна яны іх любяць, а для бацькаў — ганарыцца гэтым званнем і працягваць свой род.

***— У працяг тэмы бацькоўства. Пытанне традыцыйнае: таты сталі больш актыўна афармляць водпуск па доглядзе дзіцяці да трох гадоў ці не?***

— Сітуацыя практычна не змяняецца, у асноўным у адпачынку па доглядзе дзяцей да трох гадоў — жанчыны. Удзельная вага мужчын, якія афармілі водпуск па доглядзе, складае каля 2 %.

На мой погляд, у адносінах да водпуску спрацоўвае стэрэатып, які склаўся ў грамадстве, што догляд малых — гэта жаночы абавязак. І яшчэ прычынай можа быць няўпэўненасць бацькоў у сваіх сілах. Але ж ступень удзелу бацькоў у жыцці дзяцей вымяраецца не толькі іх знаходжаннем у сацыяльным водпуску. Напрыклад, па даных абследавання, практычна раўнамерна паміж абодвума бацькамі падзяляюцца такія абавязкі, як укладванне дзяцей спаць, дапамога з хатнімі заданнямі, гульні і правядзенне вольнага часу. Пры гэтым адзначаны цікавы факт: чым вышэйшая адукацыя бацькі, тым больш актыўна ён уцягнуты ў дзейнасць па развіцці і навучанні дзіцяці.

Мы таксама бачым актыўнасць тату сацыяльным плане. Спецыяльна да Дня бацькі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны выступіла ў ролі аднаго з арганізатараў фотапраекта «Таты». На фота прадстаўлены бацькі розных прафесій разам са сваімі дзецьмі: урач, настаўнік, спартсмен, пажарны (выратавальнік), работнік тэлебачання, дзеяч культуры. Кожны з іх расказаў невялікую, але натхняльную гісторыю свайго бацькоўства. Удзел у адборы бралі 280 кандыдатаў.

Выстава адкрылася 12 кастрычніка ў гандлёвым цэнтры Minsk City Mall і даступна для свабоднага прагляду. Спасылка на гэты праект таксама размешчана на сайце міністэрства. Мы плануем да мая 2024 года правесці такія выставы ва ўсіх абласцях.

***— Адзін з асноўных кірункаў пяцігодкі — шчаслівая сям'я. Вядома, шчасце — катэгорыя нематэрыяльная, але ўсё ж у якую суму гэта абыходзіцца дзяржаве?***

— Кіраўнік дзяржавы пастаянна адзначае, што сацыяльная палітыка, якая праводзіцца ў краіне, садзейнічае таму, каб жанчыны змаглі ўвасобіць сваё прызначэнне — вырасціць і выхаваць здаровых і шчаслівых дзяцей. Дзяржава падтрымлівае сем'і, падаючы як розныя прамыя выплаты ў выглядзе дапамог, сацыяльнай дапамогі і іншых форм фінансавай падтрымкі, так і праз ільготы і паслугі. Прывяду некалькі прыкладаў.

На выплату дапамог сем'ям з дзецьмі ў 2023 годзе прадугледжана Br3,5 млрд, больш за палову з іх Br2 млрд — на выплату дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. На сямейны капітал штогод расходуецца больш за Br300 млн. Сямейны капітал па праграме 2015—2019 гадоў прызначаўся ў доларах ЗША. На яго фінансаванне было накіравана $826 млн. З 2020 года сямейны капітал назначаецца ў беларускіх рублях. Расходы дзяржавы склалі Br1,2 млрд.

Утрыманне аднаго дзіцяці ў дзіцячым садку ў гэтым навучальным годзе складае каля Br530 у месяц, або Br6,4 тыс. у год. Пры гэтым бацькі аплачваюць толькі харчаванне — Br70—150 у месяц у залежнасці ад узросту дзіцяці, віду і рэжыму работы дашкольнай установы. На ўтрыманне дзіцячых садкоў у 2023 годзе выдзелена Br2,3 млрд.

Бясплатная адукацыя, медыцынскае абслугоўванне, санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне непаўналетніх дзяцей, забеспячэнне лекавымі сродкамі дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў і дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў і яшчэ многія іншыя меры субсідзіруюцца дзяржавай.

***— Якія яшчэ задачы ставіць дзяржава адносна сацыяльнай абароны сем'яў з дзецьмі?***

— Сярод нашых найбліжэйшых задач — пытанні сямейнага капіталу, умацаванне адраснасці сістэмы дапамог. Гэта значныя фінансавыя ўкладанні дзяржавы ў сям'ю. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што клопат дзяржавы аб сям'і павінен абавязкова суадносіцца з клопатам сям'і аб сваім дабрабыце.

Кіраўніком дзяржавы ўзнята вельмі вострае пытанне — абарона дзяцей у праблемных сем'ях. Хачу адзначыць, што сямейныя праблемы не носяць масавы характар. Але кожная сям'я, у якой ёсць хоць бы найменшыя прыкметы крызісных сітуацый, патрабуе максімальнай увагі ад дзяржаўных службаў і ад грамадства. Чаму? Бо чужых дзяцей не бывае.

У краіне 10 тысяч сем'яў, дзеці ў якіх прызнаны ў сацыяльна небяспечным становішчы, асноўная прычына (60 працэнтаў) — бацькоўскае п'янства. Але бацькі важныя для кожнага дзіцяці, нават тыя, якія сваімі безадказнымі паводзінамі пазбаўляюць яго шчаслівага дзяцінства. Таму, захоўваючы сямейнае асяроддзе для дзіцяці, узмацнілі кантроль за такімі сем'ямі і за выкарыстаннем бацькамі сацыяльных выплат у інтарэсах дзяцей.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Больш за мільён жыхароў Газы вымушаны пакінуць свае дамы



Пра гэта гаворыцца ў заяве Блізкаўсходняга агенцтва ААН для дапамогі палесцінскім бежанцам і арганізацыі работ. Раней генеральны камісар агенцтва Філіп Лазарыні заявіў, што яго арганізацыя больш не можа аказваць гуманітарную дапамогу ў сектары Газа, паколькі на яго тэрыторыі заканчваюцца вада і не хапае электраэнергіі. Па словах камісара, неўзабаве таксама скончацца прадукты харчавання і лекі. Бальніцы сектара Газа не спраўляюцца з патокам параненых. Пра гэта заявіў прадстаўнік МУС Іад аль-Бузм у каментарыі тэлеканалу Al Jazeera, паведаміла ТАСС. «Тысячам параненых пагражае хуткая смерць з-за няздольнасці бальніц справіцца з такой колькасцю пацыентаў», — падкрэсліў ён, дадаўшы, што «сотні цел загінулых усё яшчэ застаюцца пад заваламі» і не ўлічаны ў статыстыцы. Як вядома, 7 кастрычніка сітуацыя на Блізкім Усходзе рэзка абвастрылася пасля пранікнення баевікоў палесцінскай арганізацыі ХАМАС на тэрыторыю Ізраіля. Пасля нападу яўрэйская дзяржава аб'явіла аб поўнай блакадзе сектара Газа. З-за сутыкненняў ужо загінулі больш за 2,8 тысячы палесцінцаў, паранены каля 10,9 тысячы. Былі забітыя 1,5 тысячы ізраільцян, амаль 4 тысячы атрымалі раненні.

### У ЗША зафіксавана рэкордная колькасць пратэстоўцаў



Сёлета ў Злучаных Штатах колькасць работнікаў, якія ўдзельнічаюць у забастоўках, дасягнула, па меншай меры, 411 тысяч чалавек, што з'яўляецца найвышэйшым паказчыкам з 2019 года, сведчаць апошнія даныя. Аб гэтым паведаміла інфармацыйнае агенцтва «Сіньхуа». Сярод пратэстоўцаў — работнікі розных галін: аўтамабілебудаванне, ахова здароўя, гасцінічны бізнес і авіятранспарт. Забастоўкі ў гэтым годзе таксама працягваліся даўжэй, чым за ўсю найноўшую гісторыю, пра гэта сведчаць звесткі Бюро працоўнай статыстыкі і сістэмы адсочвання працоўных дзеянняў Карнельскага ўніверсітэта. Нядаўна ў ЗША праводзілася найбуйнейшая за ўсю гісторыю краіны забастоўка ў сферы аховы здароўя. Колькасць медыцынскіх работнікаў, якія выйшлі на акцыі пратэсту, перавысіла 75 тысяч чалавек. Па яе выніках прафсаюзныя лідары і каліфарнійская некамерцыйная арганізацыя аховы здароўя Kaiser Permanente так і не дамовіліся ў дачыненні да заработнай платы і вырашэння праблемы недахопу персаналу.

### Навукоўцы адзначылі паскоранае раставанне ледавікоў Антарктыкі



Часопіс Science Advances апублікаваў даследаванне па стане ледавікоў на планеце, паведамляе Associated Press. Паводле яго, са 162 шэльфавых ледавікоў Антарктыды 68 дэманструюць значнае раставанне з 1997 да 2021 года. Чатыры тузіны шэльфавых ледавікоў Антарктыкі скараціліся як мінімум на 30 працэнтаў з 1997 года, а 28 з іх страцілі за гэты час больш за палову свайго лёду. Усяго гаворка ідзе пра трыльёны тон. Расталы лёд сыходзіць у моры, і навукоўцы занепакоеныя тым, што раставанне ледавікоў Антарктыды і Грэнландыі, якое актывізавалася ў выніку змены клімату, выкліча небяспечны і значны ўздым узроўню вады ў Сусветным акіяне. Даследчыкі лічаць, што неабходна дакладна фіксаваць, як і колькі лёду губляецца з плывучых шэльфаў, каб разумець і прагназаваць будучыню Антарктыкі.

# У сталіцы ўзводзіцца больш за сотню жылых дамоў

## MINSK WORLD І «ПАЎНОЧНЫ БЕРАГ»

Жыллё будуюць як камунальныя прадпрыемствы горада, так і камерцыйныя забудоўшчыкі. Узвядзеннем 37 аб'ектаў плошчай 386,4 тысячы квадратных метраў (32 % ад агульнага аб'ёму жыллёвага будаўніцтва) займаюцца камунальнікі, на долю другіх забудоўшчыкаў прыпадае 76 аб'ектаў плошчай 827,6 тысячы «квадратаў».

Старшыня камітэта адзначыла, што найбуйнейшым камерцыйным забудоўшчыкам на тэрыторыі горада застаецца арганізацыя, якая ажыццяўляе будаўніцтва жылога комплексу Minsk World. Яго доля ў агульным аб'ёме складае каля 44 %. Цяпер у жылым комплексе ў стадыі будаўніцтва знаходзіцца 47 шматкватэрных дамоў агульнай плошчай амаль паўмільёна квадратных метраў. Да канца года плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 200 тысяч квадратных метраў жылля.

Яшчэ адзін буйны праект — «Паўночны бераг». У складзе шматфункцыянальнага жылога комплексу плануецца пабудаваць каля пяці мільёнаў квадратных метраў жылля. Зараз праект знаходзіцца на пачатковай стадыі рэалізацыі. Замежны інвестар сёлета ўжо ўвёў у эксплуатацыю парк каля вадасховішча. Разгорнута будаўніцтва чатырох жылых дамоў (каля 20 тысяч квадратных метраў) і выставачнага цэнтра. Рэалізацыя праекта прадугледжае агульную забудову да 2040 года. Ірына Гонтарава звярнула ўвагу, што найбольш маштабнае будаўніцтва ідзе цяпер у Кастрычніцкім раёне, працягваецца забудова і Маскоўскага раёна.

## ВАРЫЯНТЫ ДЛЯ ЧАРГАВІКОЎ

Найбольшая колькасць жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у тым ліку для шматдзетных сем'яў, цяпер узводзіцца ў мікрараёне Лошыца. Забудова праходзіць таксама ў межах вуліц Ангарская — Магнітная, Карвата — Геалагічная, Лагойскага тракта — вуліцы Валгаградскай, вуліц Шаранговіча — Гарэцкага і вуліцы Выгоцкага. Паводле прыведзеных аператыўных звестак, сёлета ў Мінску з задання 760 тысяч квадратных метраў жылля ўведзена ў эксплуатацыю больш за 426 тысяч квадратных метраў. З іх каля 100 тысяч «квадратаў» пабудавана для грамадзян, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу.

У сталіцы пабудавана 958 кватэр для 872 шматдзетных сем'яў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Да канца года забудоўшчыкі плануюць забяспечыць новымі жылымі памяшканнямі 1050 шматдзетных сем'яў. У планах таксама ўвесці ў эксплуатацыю чарговы электрадом на 75 кватэр у квартале вуліцы Грушаўская — завулак Разінскі — вуліца Разінская.

Асаблівую ўвагу старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама звярнула на будаўніцтва арэнднага жылля. Яна распавяла, што частка кватэр ва ўведзеным жылым доме ў межах вуліц Шаранговіча — Гарэцкага будавалася за кошт уласных сродкаў аднаго са сталічных прадпрыемстваў. Заказчыкам праекта выступала УКБ Фрунзенскага раёна. Кватэры будуць аддавацца ў арэнднае карыстанне работнікам прадпрыемстваў, кіраўніцтва якіх спадзяецца, што камфортныя жыллёвыя ўмовы будуць спрыяць замацаванню на першым працоўным месцы высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў. Ірына Гонтарава заўважыла, што калі праект акажацца паспяховым, ён атрымае падтрымку гарадскіх улад і будзе працягнуты, магчыма, у некалькі іншым выглядзе.

Шэраг перспектыўных пляцовак для будаўніцтва ўжо вызначаны ў Мінску. Імі будуць займацца раённыя УКБ, УКБ Мінгарвыканкама і ДВА «Мінскбуд». «Гэта дастаткова моцныя прадпрыемствы, асноўная задача якіх — рэалізацыя дзяржаўных праграм. Яны ў большасці сваёй задзейнічаны ў будаўніцтве сацыяльнага жылля для шматдзетных сем'яў, дзяцей-сірот і інвалідаў», — удакладніла старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама.

Жыллё ў Мінску і яго гарадах-спадарожніках практычна на 100 % узводзіцца ў энергаэфектыўным выкананні, з прымяненнем новых тэхналогій. У якасці прыкладу Ірына Гонтарава прывяла жылую забудову ў Смалявічах з выкарыстаннем новых каляровых і праектных рашэнняў у частцы ўваходных груп дамоў.

## СТАЛЬНЫЯ КАРКАСЫ

Як адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара ДВА «Мінскбуд» Аляксандр ЯЦКО**, адной з галоўных перспектыў індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, выступае прадукцыя новай прамысловай вытворчасці на базе Мінскага гарадскога тэхнапарка. Так, адна з расійскіх кампаній з удзелам УКБ Мінгарвыканкама і «Мінскбуда» плануе выпуск лёгкіх сталёвых танкасценных канструкцый (ЛСТК), якія дазволяць у самыя кароткія тэрміны ў заводскіх умовах збіраць нарыхтоўкі для каркаса любога будынка і збудавання.



«З дапамогай гэтых канструкцый на будаўнічай пляцоўцы мы зможам у мінімальны тэрмін з мінімальнымі «мокрымі» працэсамі завяршаць будаўнічыя каркасы будынка. У сувязі з гэтым мы бачым далейшае развіццё індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва менавіта ў гэтых канструкцыях», — адзначыў намеснік генеральнага дырэктара ДВА «Мінскбуд».

Прыклады выкарыстання ЛСТК ужо ёсць у краіне, досыць шырока распаўсюджаная гэтая тэхналогія і ў Расіі. Прадпрыемства плануе максімальна выкарыстоўваць новую тэхналогію ў разнастайных варыяцыях на перспектыўных участках.

«Я думаю, што лёгкія канструкцыі і па цане, і па эксплуатацыйных характарыстыках будуць дастаткова запатрабаваныя ў патэнцыяльных пакупнікоў», — лічыць Аляксандр Яцко.

## ЦЭЛЫ РАЁН З ЭЛЕКТРААЦЯПЛЕННЕМ

Паблізу новага жылога комплексу «Паўночны бераг» «Мінскбуд» пачаў узвядзенне жылога раёна шматкватэрных электрадамоў. Новы мікрараён з'явіцца ў раёне вуліцы Выгоцкага і будзе цалкам забяспечвацца электраацяпленнем.

У склад ДВА «Мінскбуд» уваходзіць 14 прадпрыемстваў агульнай колькасцю каля 16 тысяч чалавек, якія выконваюць амаль поўны інвестыцыйны цыкл па будаўніцтве любога аб'екта, удакладніў Аляксандр Яцко. Да кастрычніка трэсты прадпрыемства ўвялі 17 жылых дамоў для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Было падкрэслена, што першачарговым кірункам работы «Мінскбуда» з'яўляецца забеспячэнне дзяржзаказу па будаўніцтве жылых дамоў для гэтых катэгорый грамадзян.

Запатрабаваныя прадпрыемствы «Мінскбуда» і для будаўніцтва жылля для шматдзетных сем'яў. Дамы, якія здаюцца, не толькі ўкладваюцца ў пэўную вартасць, але і маюць сучасны выгляд і эксплуатацыйныя характарыстыкі. Цэнтральны апарат прадпрыемства таксама выступае заказчыкам жылля для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Па словах намесніка генеральнага дырэктара, у гэтым годзе цэнтральны апарат ужо забяспечыў увод жылля, даведзенага заданнем.

Ёсць у аб'яднання і перспектыўныя пляцоўкі. Прадпрыемства сёлета завяршыла комплексную забудову і трансфармацыю «Чыжоўкі 6» і «Чыжоўкі 6А». За тры гады быў знесены прыватны сектар, на яго месцы было пабудавана больш за 600 кватэр для чаргавікоў. «Цяпер гэты раён горада мае завершаны архітэктурны выгляд і, думаю, радуе гараджан», — падзяліўся меркаваннем Аляксандр Яцко.

Намеснік генеральнага дырэктара «Мінскбуда» лічыць правільным выдзяленне жылля мінчанам для рэалізацыі іх маёмасных правоў у той жа мясцовасці, дзе яны жылі да зносу дамоў. Цяпер «Мінскбуд» праводзіць вялікую забудову на больш за 120 тысяч чалавек на скрыжаванні вуліц Філімонава і Сталетава. Ільвіная доля мінчан, якія жылі ў знесеным прыватным сектары, атрымала кватэры ў новабудоўлях.

У перспектывах у прадпрыемства прамысловая забудова на вуліцы Гурскага, знос старых дамоў на вуліцы Сярова, працяг будаўніцтва ВК «Утульны». «Праектаў шмат, і ёсць усе перадумовы для выканання даведзеных горадам паказчыкаў», — рэзюмаваў намеснік генеральнага дырэктара «Мінскбуда».

## ЛОШЫЦА, ДЗІЦЯЧЫЯ САДКІ І ПАЛІКЛІНІКІ

Як вядома, праграмай прадпрыемства УКБ Мінгарвыканкама на 2023 год прадугледжана праектаванне і будаўніцтва 137 аб'ектаў. У стадыі будаўніцтва цяпер знаходзіцца 55 аб'ектаў. **Дырэктар унітарнага прадпрыемства «УКБ Мінгарвыканкама» Анжэла БАБАРЫКА** адзначыла, што іх прадпрыемства — асноўны заказчык па Мінску, які мае шэраг дачных прадпрыемстваў. Акрамя жыллёвага будаўніцтва, прадпрыемства вядзе сацыяльныя аб'екты, а таксама аб'екты будаўніцтва, якія знаходзяцца на асаблівым кантролі кіраўніка дзяржавы.

У частцы жыллёвага будаўніцтва Анжэла Бабарыка адзначыла, што прадпрыемствам ужо ўведзены ў эксплуатацыю апошнія новабудоўлі ў мікрараёнах Лошыца-8.1 і Лошыца-8.2. Пачата будаўніцтва ў Лошыцы-7, дзе ўзводзяцца два жылыя дамы для адсялення грамадзян з перспектыўных пляцовак Лошыцы-5. «Цяпер ідзе рэалізацыя маёмасных правоў грамадзян і знос дамоў. У 2025 годзе плануем прыступіць да жыллёвага будаўніцтва ў мікраёне Лошыца-5», — адзначыла дырэктар.

Упраўленне капітальнага будаўніцтва горада таксама пачало забудову Лошыцы-10. Распачаты першы дом для жыхароў, якіх адсялялі. Да ліку перспектыўных пляцовак Анжэла Бабарыка аднесла забудову на вуліцах Аваняна — Быхаўская. Вядзецца перадпраектная праца, рэалізацыя маёмасных правоў грамадзян будзе пачата з 2026 года.

Дырэктар унітарнага прадпрыемства асобна адзначыла, што пад пастаяннай увагай узвядзенне электрадомаў у Смалявічах. На гэтым аб'екце прадугледжана беспарковачная зона для камфорту жыхароў. Непадалёк нядаўна быў адкрыты дзіцячы садок, навінкой якога стала поўная камп'ютарызацыя.

Між іншым, УКБ Мінгарвыканкама ўваходзіць у лік заснавальнікаў вытворчасці лёгкіх сталёвых танкасценных канструкцый Мінскага гарадскога тэхнапарка. Менавіта таму апрабаваць гэтыя матэрыял прадпрыемства плануе пры ўзвядзенні дзіцячага садка, які з'явіцца ў жылым комплексе Minsk World.

Таксама дырэктар адзначыла, што пачалася будоўля на месцы ГРЦ «Гулівер», дзе з'явіцца новы жылы комплекс. Муніцыпальнае прадпрыемства ўжо заступіла на аб'ект, у планах — да снежня размясціць дэкларацыі па першым жылым доме. Усяго на аб'екце іх будзе чатыры.

У 2026 годзе прадпрыемства плануе пачаць узвядзенне жылля на тэрыторыі паблізу праспекта Незалежнасці — вуліца Валгаградская і вуліцы Кедышкі. У рамках інвестыцыйнай праграмы ў Мінску пачата будаўніцтва чатырох паліклінік. У маі 2025 года новая дзіцячая паліклініка з'явіцца ў мікрараёне Лошыца-9, у жніўні 2026-га адкрыецца шматпрофільная паліклініка ў пасёлку Усходні. Пачата будаўніцтва дарослай і дзіцячай паліклінік у мікрараёне Minsk World з тэрмінамі ўводу май — жнівень 2025-га.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

Будзь у курсе!

# З 10 СНЕЖНЯ НА БЧ — ГРАФІК РУХУ ЦЯГНІКОЎ НА 2023/2024 ГАДЫ

**Ён уводзіцца ў дзеянне з 0.00. Графік сфарміраваны на падставе маніторынгу попыту на перавозкі і напрамкі пераважных пасажырапатокаў, а таксама выканання патрабаванняў сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў Рэспублікі Беларусь па абслугоўванні насельніцтва ў галіне транспарту. Графік будзе дзейнічаць цягам года, інфармуе прэс-цэнтр магістралі.**

З 10 снежня міжнародныя пасажырскія перавозкі ў зносінах Беларусь — Расія будуць арганізаваны па асноўных пасажыраўтваральных напрамках у прамых і беспасадачных зносінах з Масквой, Санкт-Пецярбургам, Калінінградам, Адлерам, Анапай, Мінеральнымі Водамі, Самарай, Мурманскам і Архангельскам (праз Маскву, Яраслаўль і Волагду). Таксама ў летні перыяд 2024 года павялічана перыядычнасць курсіравання цягнікоў да Адлера, Анапы і Калінінграда.

Са снежня будуць курсіраваць беспасадачныя вагоны Мінск — Мінеральныя Воды з перыядычнасцю праз дзень і Мінск — Архангельск (праз Смаленск, Маскву, Яраслаўль, Волагду) з перыядычнасцю адзін раз на тыдзень. Акрамя таго, працягне курсіраваць цягнік міжнародных ліній Мінск — Самара з перыядычнасцю адзін раз на тыдзень, а цягнік № 68/67 Смаленск — Санкт-Пецярбург будзе накіроўвацца з прыпынкам на станцыі Віцебск праз дзень.

У новым графіку руху пасажырскіх цягнікоў у перыяды павышанага попыту на пасажырскія перавозкі па маршруце Мінск — Санкт-Пецярбург і Полацк — Масква будуць курсіраваць дадатковыя цягнікі, а таксама захаваны дзеючы парадак курсіравання беспасадачных вагонаў у зносінах Пскоў — Мінск — Пскоў у перыяд павелічэння пасажырапатоку.

Для забеспячэння перавозкі пасажыраў па перадвыхадных, выхадных і святочных днях у графіку руху прадугледжаны дадатковыя цягнікі, якія будуць курсіраваць па найбольш папулярных у пасажыраў маршрутах як у міжнародных зносінах, так і ў межах краіны.

Са снежня па маршруце Віцебск — Мінск — Віцебск будзе прызначаны новы цягнік міжрэгіянальных ліній з перыядычнасцю курсіравання па пятніцах і нядзелях, а таксама ў перадсвяточныя і святочныя дні. Маршрут цягніка міжрэгіянальных ліній № 635 Мінск — Пінск будзе працягнуты да станцыі Брэст-Цэнтральны з прыпынкамі ў раённых цэнтрах Іванава (станцыя Янаў-Палескі), Драгічын, Кобрын і Жабінка.

Графік руху цягнікоў рэгіянальных ліній эканомкласа і гарадскіх ліній сфарміраваны на падставе маніторынгу попыту на перавозкі, а таксама ў выніку праведзенай сумеснай работы з абласнымі выканаўчымі камітэтамі па аптымізацыі памераў руху на малаінтэнсіўных участках і арганізацыі рэгулярных аўтамабільных перавозак прадугледжвае курсіраванне 254 пар цягнікоў рэгіянальных ліній эканомкласа і 36 пар цягнікоў гарадскіх ліній.

Больш падрабязную інфармацыю аб графіку руху цягнікоў, кошце і правілах праезду можна атрымаць на афіцыйным інтэрнэт-сайце Беларускай чыгункі rw.by і з дапамогай афіцыйнага мабільнага дадатку «БЧ. Мой поезд».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ІНАВАЦЫЙНЫЯ, ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ, АЙЧЫННЫЯ...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

*І мы ўпэўніліся, што працуем у патрэбным кірунку. Прадпрыемствы, якія прадставілі свае праекты, выкарыстоўваюць сучасныя інтэлектуальныя тэхналогіі, робататэхніку, тэхналогіі віртуальнай рэальнасці. Гэтыя праекты вельмі значныя для ўсёй краіны і адпавядаюць кірункам дзяржпраграмы «Лічбавае развіццё Беларусі».*

Вельмі важна, што праекты ствараюцца ўнутры краіны і айчыннымі спецыялістамі. ІТ-галіна ўкараняе ўвесь свой напрацаваны гадамі вопыт у айчынныя праекты. Цяпер шмат праектаў па лічбавай трансфармацыі бізнес-працэсаў, то-бок прадпрыемствы становяцца мабільнымі, пераходзяць на электронную камерцыю, становяцца адкрытымі для сусветнага грамадства і могуць супрацоўнічаць з рознымі краінамі. У будучыні ў Беларусь прыйдзе вялікая колькасць заказчыкаў, каб і далей прасоўваць і развіваць ІТ-індустрыю, перакананa старшыня экспертнага савета.

Летась удзельнікамі сталі праекты з больш за дзясятак галін эканомікі, а сёлета свае дасягненні мяркуюць паказаць ужо каля 20 прадпрыемстваў, у тым ліку з галіны энергетыкі, нафтаперапрацоўкі, авіяцыйных тэхналогій, банкаўскай сферы. Арганізатары спадзяюцца, што сёлетнія праекты таксама пакажуць высокі ўзровень выкарыстання сучасных лічбавых тэхналогій.

Гэтым разам у конкурсе акцэнт зрабілі на намінацыі, звязаныя з прасоўваннем прадпрыемстваў у цэлым, а не толькі праектаў ці прадукцыі, таму адна з намінацый так і гучыць — «Кампанія года — лідар у сферы лічбавізацыі і лічбавай трансфармацыі», удакладніла **Ірына СЕДЛЕР, намеснік старшыні аргкамітэта конкурсу**:

*— Новай намінацыяй стала «Лідар па імпартазамяшчэнні замежнага праграмнага забеспячэння», таму што самае галоўнае — наш інтэлект, нашы ўласныя праграмныя прадукты. Дадалі таксама намінацыі «Рэалізаваны праект па імпартазамяшчэнні замежнага праграмнага забеспячэння», «Рэалізаваны праект з прымяненнем BIM-тэхналогій» (для будаўнічых прадпрыемстваў і кампаній).*



## НАРОДНАЕ БАГАЦЦЕ

У эканамістаў ёсць такое паняцце, як «народнае багацце», якое складаецца з сукупнасці кампанентаў: прыроднага капіталу, фізічнага і нематэрыяльнага, у тым ліку інстытуцыянальнага, заўважыў **Сяргей ШАЎРОЎ, дацэнт кафедры арганізацыі вытворчасці і эканомікі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта**:

*— Інстытуты дзяржавы ў эканамічнай тэорыі сёння падзяляюцца на палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і інавацыйна-тэхналагічныя. І ўвесь свет цяпер лічыць, што інавацыйна-тэхналагічныя інстытуты сёння — гэта народнае багацце. Ёсць, напрыклад, інстытут фінтэх, які працуе ў фінансавай сферы; ёсць інстытут, які працуе з лічбавай нерухомасцю; ёсць электронны ўрад, электронае кіраванне тэрыторыямі. Усё гэта лічбавыя экасістэмы — тэрмін, які з'явіўся і ў заканадаўстве. Гэтымі экасістэмамі могуць карыстацца людзі ва ўсім свеце.*

На думку эксперта, неабходна вылучаць праекты з перспектывай стаць нацыянальнай ці транснацыянальнай платформай. У апошніх ёсць вялікая капіталізацыя:

*— Наша дзяржава цяпер распрацоўвае адзіную тэхналагічную палітыку развіцця лічбавых тэхналогій на наступнае дзесяцігоддзе. Калі мы набяромся вопыту падчас конкурсу і дадзім рэкамендацыі тым кампаніям, якія займаюцца падобнымі праектамі, гэта будзе вельмі карысная работа.*

## ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ ДЛЯ ДАПАМОГІ ЎРАЧАМ

Інфармацыйныя тэхналогіі і іх укараненне ва ўсе галіны народнай гаспадаркі — вельмі важны кірунак. Што датычыцца развіцця тэхналогій у медыцыне, то тут існуюць праблемы рознага ўзроўню, акрэсліў **Васіль КАВАЛЁЎ, загадчык лабараторыі аналізу біямедыцынскіх выяў Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі**:

*— Напрыклад, стварэнне нейкіх базавых сродкаў назапашвання медыцынскіх даных, аўтаматызацыя працэсаў выпіскі рэцэпта і атрымання лекаў у аптэцы стварае аснову для функцыянавання больш высокіх і развітых у пэўным сэнсе форм. Адна з найважнейшых ІТ-задач у гэтай галіне — аўтаматызацыя працэсаў дыягностыкі захворванняў. Тэхнічных сродкаў для гэтага шмат (аналіз здымкі выяў пацыентаў, камп'ютарнай тамаграфіі, ультрагукавых даследаванняў). Ва ўсім свеце існуе разуменне, што ІТ-сродкі могуць павысіць эфектыўнасць гэтага працэсу, які жыццёва важны для кожнага з нас, за кошт наяўнасці другога меркавання. Дыягназ ставіцца ўрачамі, але ж для іх падтрымкі шмат функцый неабходна аўтаматызаваць, і гэтыя функцыі ўжо няпростыя, якія на сённяшнім этапе развіцця адносяцца да сферы штучнага інтэлекту. Гэта найбольш перадавы фронт, дзе працуе ўжо досыць шмат спецыялістаў. Рабіць гэта можна толькі ў цесным супрацоўніцтве з урачамі і медцэнтрамі.*

Сфера штучнага інтэлекту датычыцца не толькі аўтаматызацыі дыягностыкі захворванняў, але і іншых функцый, якія раней мог рабіць толькі чалавек. Існуе шмат праблем, якія патрабуюць фундаментальных ведаў у гэтай галіне, і ў Акадэміі навук па меры сіл займаюцца гэтымі праблемамі. Навукоўцы хочуць, каб Беларусь працягвала заставацца экспартна арыентаванай краінай, якая выраблае прадукцыю высокай якасці і пастаўляе яе ў самыя розныя краіны, таму яны абавязаны займацца самымі дасканалымі тэналогіямі, якія даступныя сёлета, у прыватнасці выкарыстаннем нейронных сетак, удакладніў спецыяліст.

Пераможцаў сёлетняга конкурсу ўзнагародзяць у снежні падчас канферэнцыі «Лічбавая трансфармацыя прадпрыемстваў і галін Рэспублікі Беларусь», расказалі арганізатары.

**Ірына СІДАРОК.**

Тэхналогіі

# ЛІЧБАВЫ БІЛЕТ ІДЗЕ «Ў АДРЫЎ»

**За 9 месяцаў на цягніках Беларускай чыгункі аформлена 8 мільёнаў электронных білетаў. Са студзеня да верасня пасажыры замовілі праз інтэрнэт 6,2 мільёна электронных білетаў на цягнікі з нумараванымі месцамі і 1,8 мільёна квіткоў на цягнікі з ненумараванымі месцамі (гарадскіх ліній і рэгіянальных ліній эканомкласа).**

Самы актыўны рост — у сегменце электронных білетаў на цягнікі міжнародных, міжрэгіянальных ліній і рэгіянальных ліній бізнес-класа, аформленых на сайце pass.rw.by і з дапамогай мабільнага дадатку «БЧ. Мой цягнік». Іх доля складае 77 працэнтаў ад агульнай колькасці прададзеных праязных дакументаў. Для параўнання: летась электронныя білеты на цягнікі з нумараванымі месцамі набывалі 57 працэнтаў пасажыраў.

Найбольш запатрабаваным каналам самаабслугоўвання пры афармленні праезду на цягніках з ненумараванымі месцамі застаюцца тэрміналы самаабслугоўвання. Імі скарысталіся 5,9 мільёна пасажыраў, што складае 15 працэнтаў ад агульнага аб'ёму пасажыраў, перавезеных за 9 месяцаў года цягнікамі з ненумараванымі месцамі.

Беларуская чыгунка працягвае ўдасканаленне беспапяровых тэхналогій і дыстанцыйных сэрвісаў, імкнецца зрабіць іх максімальна простымі, даступнымі і зручнымі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Класныя навіны

# ПРА ГРОШЫ, СЯМЕЙНЫ БЮДЖЭТ І ВІДЫ ПАДАТКАЎ...

**Нацыянальны банк, Міністэрства адукацыі і аўтарскі калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта падрыхтавалі вучэбна-метадычны комплект «Асновы фінансавай адукаванасці» для факультатыўных заняткаў навучэнцаў 5—7-х класаў, які складаецца з дапаможніка для школьнікаў і дапаможніка для настаўнікаў. Ён адобраны Нацыянальным інстытутам адукацыі і рэкамендаваны для выкарыстання ў навучальным працэсе.**

У даступнай і займальнай форме разам з галоўным персанажам — хлопчыкам Алёшам і яго сям'ёй — школьнікі будуць спасцігаць асновы фінансавай адукаванасці. Пяцікласнікі даведаюцца, што такое грошы, бюджэт, як фарміруюцца даходы і выдаткі сям'і, як рабіць зберажэнні і запазычанні. У шостым класе школьнікаў пазнаёмяць з дзейнасцю банкаў і асноўнымі банкаўскімі аперацыямі, навучаць распазнаваць хітрыкі ашуканцаў, раскажуць, як працуе сістэма страхавання, у чым розніца паміж прадпрымальнікам і наёмным работнікам. У рамках факультатыўных заняткаў па фінансавай адукаванасці ў сёмым класе навучэнцы даведаюцца аб тым, што такое дзяржаўны бюджэт, якія віды падаткаў існуюць, як дзейнічаюць пенсійная сістэма і сістэма сацыяльных выплат.

Дапаможнік для настаўнікаў, у сваю чаргу, закліканы аказаць дапамогу педагогам пры падрыхтоўцы і правядзенні факультатыўных заняткаў.

Нацыянальны банк плануе надрукаваць 6 тысяч экзэмпляраў вучэбна-метадычных камплектаў, якія будуць перададзены ў бібліятэкі ўсіх устаноў агульнай сярэдняй адукацыі краіны. Акрамя таго, электронная версія размешчана ў свабодным доступе на Адзіным партале фінансавай адукаванасці насельніцтва www.fingramota.by, а таксама на Нацыянальным адукацыйным партале.

У 2021 годзе Нацыянальны банк стаў ініцыятарам выдання першага ў Беларусі вучэбна-метадычнага комплексу па асновах фінансавай адукаванасці для факультатыўных заняткаў у 8—9-х класах, які быў на бязвыплатнай аснове перададзены ва ўстановы адукацыі па ўсёй Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# ПРЫЧАКАЛІ СНЕГ З ГАЛАЛЁДАМ

## Будзе на 1—4 градусы халадней за норму

**Падобна на тое, што цёплыя выхадныя былі апошнімі ў гэтым сезоне. Як паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды нас чакае паўнавартасны снег і начныя замаразкі.**

У першай палове тыдня пад уплывам халоднай няўстойлівай паветранай масы, якая паступае з Балтыйскага мора, тэмпературны фон у нашай краіне панізіцца, і стане ўжо на некалькі градусаў ніжэй за норму, а ападкі пачнуць пераходзіць у змешаную фазу. Згодна з папярэднім прагнозам, у другой палове тыдня на тэрыторыю нашай краіны накіруюцца халодныя паветраныя масы арктычнага паходжання. Тэмпературны фон панізіцца яшчэ больш, а ападкі пачнуць выпадаць у выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу.

Ужо ў аўторак месцамі па краіне пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы, магчымы мокры снег. Уначы ў многіх раёнах чакаюцца замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў, месцамі тэмпература паветра складзе плюс 1—3 градусы. Днём тэмпература будзе ў межах ад 6 да 11 цяпла.

У сераду ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, у дзённыя гадзіны па поўначы ў асобных раёнах — моцныя ападкі. Уначы тэмпература дасягне плюс 1—6 градусаў, а ў асобных раёнах апусціцца да мінус 3. Тэмпература паветра днём будзе вагацца ад плюс 4 да 11 градусаў.

У чацвер ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны, днём месцамі па паўночным усходзе пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У начныя і ранішнія гадзіны на асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы ў многіх раёнах чакаюцца замаразкі да мінус 4 градусаў, месцамі тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 1 да 5 цяпла. Днём будзе ад плюс 2 градусаў па поўначы да плюс 10 на поўдні краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у пятніцу стане халадней. У гэты дзень месцамі па краіне сіноптыкі абяцаюць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Ноччу і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы ў многіх раёнах прагназуюцца замаразкі ад 0 да мінус 5 градусаў, а месцамі тэмпература паветра складзе плюс 1–2 градусы. Днём чакаецца ад 0 да 6 цяпла. У суботу ноччу месцамі, раніцай і днём у многіх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, днём з дажджом. Уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Днём месцамі слабы галалёд. Ноччу ў многіх раёнах замаразкі да мінус 5 градусаў, а тэмпература паветра днём будзе ў межах ад 0 да плюс 5 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона, место нахождения:
г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 017 516-80-61)
по поручению **районного унитарного предприятия «Любанское ЖКХ»**
(продавец, место нахождения: г. Любань, ул. Ленина, 2,
тел. (8029) 195-05-55)
проводит открытый аукцион по продаже:

## ЛОТ № 1: АДМИНИСТРАТИВНОЕ ПОМЕЩЕНИЕ

**с инв. № 643/D-6029, общей площадью 44,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Первомайская, 45А-1 *(право хозяйственного ведения)*.**
**Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 623450100001003170, пл. – 0,0532 га.**
Начальная цена без НДС **– 9 650,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 965,00** бел. руб.
Объект обременен договором аренды по 15.03.2025.

## ЛОТ № 2: АДМИНИСТРАТИВНОЕ ПОМЕЩЕНИЕ

**с инв. № 643/D-6030, общей площадью 77,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Первомайская, 45А-4 *(право хозяйственного ведения)*.**
**Сведения о земельном участке:**
**кадастровый номер – 623450100001003170, пл. – 0,0532 га.**
Начальная цена без НДС **– 14 650,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 1 465,00** бел. руб.
**Стоимость лотов снижена на 50 %.**
**Информация о торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by.**

Аукцион состоится **01.11.2023** в **12.00** по адресу:
г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **31.10.2023** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (801794) 68-7-06; (8029) 195-05-55.**

УНП 600208822

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Криница» (Продавец)

Аукцион состоится **30.10.2023 в 14.00** по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1, состав:**

1. Контрольный пост и проходная, инв. № 621/С-1161, 66,5 кв. м,
2. Здание подсобного блока, инв. № 621/С-1163, 1138,5 кв. м.
3. Помещение мойки пивовозов, инв. № 621/С-1164, 113,6 кв. м.
4. Насосная станция над артскважиной, инв. № 621/С-1166, 50,1 кв. м.
5. Здание насосно-фильтровальной станции, инв. № 621/С-1168, 254,6 кв. м.
6. Сушильный цех, инв. № 621/С-1170, 264,2 кв. м.
7. Административное здание, инв. № 621/С-1171, 322,3 кв. м.
8. Здание главного корпуса, инв. № 621/С-1172, 4055,3 кв. м.
9. Сооружение площадка для стеклобоя, инв. № 621/С-3617, 111,6 кв. м.
10. Здание котельной, инв. № 621/С-17178, 517 кв.м.
11. Внеплощадочные и площадочные сети водопровода, инв. № 621/С-20589, 2994 м,
12. Кабельная ЛЭП, инв. № 621/С-20588, 1196,7 м.
13. Внеплощадочные и площадочные сети канализации, инв. № 621/С-20587, 2462,2 м,
14. Низковольтные сети промплощадки, инв. № 621/С-20586, 3028 м.
15. Площадочные тепловые сети, инв. № 621/С-20584, 393 м.
16. Сети газопровода, инв. № 621/С-20581, 248 м.
17. Артскважина с насосом ЭВЦ 10х63-110, инв. № 621/С-1028912.
18. Благоустройство (проезды, площадки, ограждения), площадь – 11365,0 кв. м.
19. Резервуар промывочной воды, площадь – 27,0 кв. м.
20. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб, площадь – 148,3 кв. м.
21. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб, площадь – 151,5 кв. м.
22. Движимое имущество (перечень на сайте Организатора аукциона ino.by).
23. Объекты растительного мира (перечень на сайте Организатора аукциона ino.by).

**Адрес** Лота № 1:
Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Кутузова, 7; 7/5; 7/2; 7/1; 7/4; 7/9; 7/8; 7/7; 7/6;
Артскважина:
Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, 11

**Начальная цена** с НДС 20 % – 4 584 325,20 руб.
Задаток – 500 000,00 руб.

Земельные участки:
1. 624250100001000118, 5,2100 га;
624250100001000119, 0,3600 га.
Право постоянного пользования.
**Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **26.10.2023 в 11.00**.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества
**ООО «ОЛСЕМА»** (УНП 191561221),
объявляет о проведении **27.10.2023 г.** в 09.00
публичных торгов в электронной форме

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 17 ноября 2023 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка (лоты №№ 1, 2, 3, 4)**, необходимого для обслуживания предмета аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Покупателя | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14328** общей площадью **692,4** кв. м, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/10, гараж.<br>**Капитальное строение с инв. № 320/С-38833** общей площадью **4 241,6 кв. м**, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания транспортного цеха** (составные части и принадлежности: А – Автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа» г. Жлобина.<br>**Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9 | **238 800,00** | 23 880,00 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-34609** площадью **894,4 кв. м**, назначение – складское помещение, наименование – **изолированное помещение № 5**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-5. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000003000135** общей площадью **16,3759 га – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 961/1000). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1 | **105 360,00** | 10 536,00 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-34612** площадью **3 453,9 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 8**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-8. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000003000135** общей площадью **16,3759 га – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 961/1000). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1 | **415 031,45** | 41 503,15 |
| 4 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-34622** площадью **9 151,1 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 14**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-14. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000003000135** общей площадью **16,3759 га – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 961/1000). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1 | **1 018 373,80** | 101 837,38 |

**Продавец:** ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович.

**Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** Р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 17 октября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 15 ноября 2023 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.**

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затрат за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

## ООО «Реалконсалтинг» извещает о проведении открытого аукциона № 19/23 по продаже многофункционального здания в г. Минске

Предмет аукциона:

Лот № 1 **– Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-13013838, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Юрово-Завальная, 13, площадь – 1516,4 кв. м, назначение – Здание многофункциональное, наименование – Многофункциональное общественное здание.**

**В состав лота также входят изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7988199443, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Юрово-Завальная, 13-1 (площадь – 525,1 кв. м, назначение – Помещение общественного питания, наименование – Помещение общественного питания), изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7988199444, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Юрово-Завальная, 13-2 (площадь – 149,3 кв. м, назначение – Помещение бытового обслуживания населения, наименование – Помещение бытового обслуживания населения).**

**Начальная цена продажи лота – 3 428 600 долларов США с учетом НДС 20 %,** сумма задатка – 30 000 бел. руб., шаг аукциона – 5 % от начальной цены продажи

**Организатор аукциона: ООО «Реалконсалтинг», ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. г. Минск, 220015.**
**Продавец: ООО «ГРАНДЭЛИТ», ул. Танковая, 15-1, этаж 2, каб. 11, г. Минск, 220031**

Для участия в аукционе необходимо:
1. Внести задаток в указанном размере на расчетный счет продавца BY09ALFA30122C81260010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, ул. Сурганова, 43-47, БИК ALFABY2X, получатель платежа – ООО «ГРАНДЭЛИТ», УНП 690336594, назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе № 19/23»;
2. Подать заявление на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукциона № 19/23 (далее – Положение).

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8.
**Последний день приема заявлений и внесения задатка: 15.11.2023 до 17.00**

**Аукцион состоится 17.11.2023 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, п. 701**

Победителем аукциона объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику с его согласия по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником, согласившимся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением, в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона путем перечисления на расчетный счет Организатора суммы этих затрат.
Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 30 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня заключения договора купли-продажи, если стороны договора не договорятся об ином сроке.
Оплата предмета аукциона производится в белорусских рублях по курсу доллара США к белорусскому рублю, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату платежа, при этом победителю аукциона и единственному участнику, согласившемуся приобрести предмет аукциона по цене, увеличенной на 5 процентов, внесенный задаток учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона, по курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату заключения договора.
Другим участникам задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона

**Контакты: +375 (17) 256-61-35 • +375 (25) 549-86-22 • auction@expertiza.by http://www.expertiza.by**

# ВЫКІНУЦЬ НЕЛЬГА ВЫБРАЦЬ

## Ці вырвецца чалавецтва з пластыкавай пасткі?

**Штогод у свеце ўтвараецца каля 300 мільёнаў тон пластыку, які забруджвае планету і ўбудоўваецца ў харчовыя прыродныя ланцужкі, з аднаго боку. З другога — ён паляпшае і спрашчае жыццё чалавецтва, якому, тым не менш, даўно варта зменшыць памеры свайго апетыту на «ўдасканаленне найлепшага», бо добрая трэціна таго, што трапляе ў смецьцевыя кантэйнеры, не можа быць перапрацавана ў прынцыпе, а цалкам адмовіцца ад выкарыстання пластыку немагчыма. Які пластык лягчэй за ўсё выбраць з адходаў і якія яго віды можна перапрацаваць? Ці такі добры біяраскладальны пластык і як зрабіць пластык больш «добрым»? Чаму пластык у свой час стаў ратавальнікам чалавецтва? Што можа зрабіць кожны, каб захаваць Зямлю ад несупыннага знішчэння? Адказы на гэтыя пытанні шукалі эксперты падчас тэматычнага круглага стала.**



### ЭКАЛАГІЧНАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА ПАКЕТАМ

Пластык — даволі ўстойлівы лёгкі танны матэрыял, які можа выкарыстоўвацца ў шырокім дыяпазоне. Ён небяспечны тым, што мае вельмі працяглы перыяд распаду: ад 100 да 1000 гадоў, а, трапляючы ў навакольнае асяроддзе, раскладаецца на так званы мікрапластык, які трапляе ў харчовыя ланцужкі і можа апынуцца ў тым ліку і ў арганізме чалавека. Акрамя таго, пры гарэнні пластыку ў атмасферу выкідаецца мноства канцэрагенаў, якія забруджваюць паветра і разбураюць азонавы слой. А сыравіна для вырабу пластыку і поліэтыленаў — найважнейшыя неаднаўляльныя прыродныя рэсурсы: вугаль, нафта, газ. Адпаведна, чым больш ствараецца пластыкавых вырабаў, тым у большых аб'ёмах расходуюцца гэтыя рэсурсы, адзначыў **Максім ТАРАСАЎ, начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя**:

— *У кантэксце экалагічнай бяспекі «добрымі» пластыкамі з масы адходаў можна лічыць тыя, што лепш перапрацоўваюцца. Гэта поліэтылентэрафталат, поліэтылен, поліпрапілен. «Менш добрыя», а ў большай ступені «дрэнныя» — вырабы з полістыролу і пенаполістыролу.*

Лепш за ўсё з агульнай масы адходаў здабываюцца буйныя пластыкавыя вырабы, а найгорш (іх увогуле практычна немагчыма выбраць) — дробныя вырабы, у тым ліку ўпаковачныя пакеты. Сёння на касах супермаркетаў прадаюцца біяраскладальныя пакеты, якія пазіцыянуюцца як экалагічная альтэрнатыва звычайным пластыкавым пакетам, аднак не ўсё так адназначна, падкрэсліў спецыяліст:

— *Адзін з найбольш распаўсюджаных тыпаў біяраскладальнага пластыку — так званыя оксараскладальныя пластыкі. Гэта, па сутнасці, — звычайная пластмаса, якая мае ў сваім складзе спецыяльныя дабаўкі. За кошт гэтых дабавак паскараецца акісленне, распад матэрыялу пад уздзеяннем цяпла, ультрафіялету, кіслароду. Аднак гэта таксама мікрапластык, які дастаць з наваколля ўжо немагчыма. Другі від біяраскладальных пластыкаў — так званыя вырабы з полілактыдаў, якія лічацца адным з самых перспектыўных біяраскладальных пластыкаў. Яго атрымліваюць з лактыдаў пры кандэнсацыі малочнай кіслаты, якая ў сваю чаргу здабываецца з адходаў вытворчасці сельскай гаспадаркі. Так і пластык, у прынцыпе, можна кампаставаць, бо ён раскладаецца на біямасу, ваду, вугляксілы газ і метан.*

### ВЫЗНАЧАНА ЗАКОНАМ, ВЫБРАНА ПАКУПНІКОМ

Пераважная большасць пластыкавых адходаў — гэта пластыкавая ўпакоўка (пакеты, пенапластавыя вырабы, аднаразовы посуд), і ўвага міжнароднай супольнасці засяроджана найперш на пытаннях папярэджання і памяншэння ўздзеяння менавіта такіх адходаў на наваколле. Яшчэ ў 2019 годзе была адобрана дырэктыва ЕС аб зніжэнні ўздзеяння некаторых пласмасавых вырабаў на наваколле, згодна з якой з 2021-га на тэрыторыі Еўрапейскага саюза ўводзіцца забарона на выкарыстанне аднаразовых пластыкавых талерак, кантэйнераў, кубачкаў, посуду для фастфуду, відэльцаў, лыжак, нажоў, нагадаў Максім Тарасаў:

— *У Беларусі з 2020 года рэалізоўваецца план мерапрыемстваў, скіраваны на паэтапнае зніжэнне выкарыстання палімернай упакоўкі і яе замяшчэнне экалагічна бяспечнай. У рамках плана з 1 студзеня 2021-га ў краіне ўведзена забарона на выкарыстанне і продаж пэўных відаў аднаразовага пластыкавага посуду ва ўстановах грамадскага харчавання. Як вынік, шэраг прадпрыемстваў у краіне павялічылі магутнасці па вырабе ўпакоўкі з паперы, кардону, шкла, у тым ліку і аднаразовага пластыкавага посуду. Дзяржстандартам распрацаваны шэраг дзяржаўных стандартаў па вызначэнні здольнасці пластмасавых вырабаў да поўнага аэробнага біялагічнага раскладання. Распрацоўваецца дзяржстандарты на шматабаротную ўпакоўку. Цяпер уносяцца змены ў Тэхнічны рэгламент Мытнага саюза «Аб бяспецы ўпакоўкі», які вызначае абавязковыя для прымянення і выканання на таможнай тэрыторыі патрабаванні да ўпакоўкі. У прыватнасці, даецца паняцце «біяраскладальная ўпакоўка».*



Немалую ролю ў зніжэнні выкарыстання пластыкавай упакоўкі іграюць буйныя гандлёвыя сеткі (рытэйлеры). Хоць цэлафану ў крамах, як і раней, шмат, але ў іх павялічылася і колькасць экалагічна бяспечнай упакоўкі: тэкстыльныя шматразовыя торбы, папяровыя пакеты, біяраскладальныя пакеты з раслiннай сыравіны. Пакупнік сам можа вызначыцца, ці адмовіцца яму ад поліэтыленавых пакетаў на карысць шматразовай упакоўкі, якую можна перапрацаваць. Тым самым вытворцы мусяць пераарыентавацца на экалагічныя запыты насельніцтва, тым больш што экаўпакоўка становіцца трэндам.

### НАВЯЗАНАЯ СПАЖЫВЕЦКАЯ ПСІХАЛОГІЯ

Колькасць людзей ужо набліжаецца да дзесяці мільярдаў. Зірнуць на «пластыкавую» праблему з пункту гледжання ўсіх штучна створаных чалавекам матэрыялаў прапанаваў **Валерый ГАНЧАРОЎ, дырэктар цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі**:

— *Чалавецтва развіваецца ў рамках закона адзінства і барацьбы супрацьлегласцяў — з аднаго боку, яно імкнецца да экспансіі і жадае захапіць усё навакольнае, падпарадкаваць сабе прыроду, з іншага — у намаганнях чалавецтва прысутнічаюць элементы самаразбурэння. Калі мы перавысім разумную мяжу, Зямля можа стрэсці з сябе чалавецтва з-за тэхнагеннай нагрузкі. Здабываючы руды, мы перамяшчаем вялікія масы з-пад паверхні зямлі наверх — як вынік, магчыма абрынанне. Тэктанічныя зрухі мы правакуем нашымі дзеяннямі ў галіне пераўтварэння і атрымання энергіі. Я прыхільнік больш узважанага падыходу. Калі мы кажам, што цалкам адмаўляемся ад штучна створаных матэрыялаў, то вяртаемся да натуральнай гаспадаркі. Ідзём у пячоры, здабываем крэмній і дзікіх жывёл.*

Па сутнасці, пластык у свой час стаў хіба што не панацэяй для бяднага і добрага жыцця чалавецтва, але сёння яно сутыкнулася з тым, што вырабіла зашмат і надта нагрузіла прыроду. Каб абараніцца ад пластыкавага засілля, трэба правільна ўтылізаваць яго і пускаць у другасны абарот, перакананы дырэктар цэнтра.

— *Аднак многія рэчы з пластыку, створаныя аднойчы, вельмі цяжка вярнуць у папярэдні стан. Пытанне ў тым, як спалучаць штучна створаныя і прыродныя матэрыялы і не загнаць сябе ў пастку спажывання. Магчыма, адзін з правільных адказаў — рацыянальнасць (недзе на мяжы з самаабмежаваннем) спажывання. Пры абнаўленні тых жа гаджэтаў, якія нам навязваюць вытворцы і якія, па сутнасці, адрозніваюцца толькі нумарацыяй і нейкімі моднымі штучкамі, але ж функцыянал мабільнага ад гэтага не мяняецца (першапачаткова ён задумваўся проста як сродак камунікацыі), нам навязваецца спажывецкая псіхалогія, што недзе ўжо і сорамна мець тэлефон не самай апошняй мадэлі. І гэта зноў вядзе да здабычы рэсурсаў, загрузкі чалавецтва новымі абавязкамі і ў нечым нават забыцця свайго псіхалагічнага і духоўнага развіцця.*

### ЯК ЗРАБІЦЬ ПАЛІМЕР БОЛЬШ «ДОБРЫМ»

Калі разбіраць пластык з пункту гледжання хіміі, то гэты матэрыял з'яўляецца, па сутнасці, кампазітам — складаецца як з палімерных складальнікаў, так і з непалімерных. Таму большасць праблем, якія звязаны з прымяненнем пластыкаў, датычыцца не толькі палімераў, але і напаўняльнікаў, фарбавальнікаў, пластыфікатараў, якія выкарыстоўваюцца пры стварэнні палімераў. Цяперашняе стагоддзе нездарма называюць векам пластыку, і ён сапраўды мае станоўчыя і адмоўныя моманты, заўважыў **Аляксандр РАГАЧОЎ, дырэктар інстытута хіміі новых матэрыялаў НАН Беларусі**:

— *Адзін з магчымых варыянтаў — выкарыстанне так званых біяраскладальных пластыкаў, асновай для вырабу якіх з'яўляецца харчовая сыравіна, якую можна ўжываць у ежу. Аднак калі браць эканамічны бок, то і тэхналогіі, і абсталяванне для вырабу такіх пластыкаў робіць іх досыць дарагімі ў параўнанні з традыцыйнымі, што выкарыстоўваюцца больш шырока, у тым ліку і для ўпакоўкі. Найбольш верагодна, што трэба сумяшчаць палімерную ўпакоўку і папяровую. З аднаго боку, гэта павысіць спажывецкія здольнасці папяровай упакоўкі, з другога — можна выкарыстоўваць больш біяраскладальных палімераў і менш «дрэнных». Аднак праблема павышэння добрага складальніка палімераў даволі комплексная і з пункту гледжання хіміі досыць складаная. Напаўняльнікі пластыку дазваляюць падоўжыць тэрмін захоўвання прадуктаў у добрай упакоўцы, і Акадэмія навук працуе над стварэннем новых відаў бяспечных фарбавальнікаў, якія пры распадзе не даюць небяспечных кампанентаў.*

### МЕНШ УЖЫВАЦЬ І ПРАВІЛЬНА ЗБІРАЦЬ

Існуюць пластыкі, якія немагчыма перапрацаваць у прынцыпе. Гэта шматслойная ўпакоўка, якая ўтрымлівае металы, палімеры і паперу, поліэтыленавыя пакеты і іншае. Тым не менш, хоць цалкам адмовіцца ад пластыку немагчыма, можна зменшыць колькасць яго выкарыстання шляхам замены пластыкавай упакоўкі экалагічна бяспечнай біяраскладальнай. Часткова можна прымяняць абмежавальныя меры, лічыць **Іван БАРАНОЎСКІ, намеснік дырэктара па навуцы Інстытута жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН Беларусі**:

— *Сёння ўжо больш за 60 краін увялі заканадаўчыя абмежавальныя меры па ўжыванні пластыку ў штодзённым жыцці. Задача ў тым, як наладзіць збор і перапрацоўку такім чынам, каб мінімізаваць паступленне такіх адходаў у наваколле. І вырашэнне яе замыкаецца на спажыўцах. Калі не стымуляваць у людзях экалагічную свядомасць, то пытанне будзе вырашацца вельмі складана, а эфект — дасягацца вялікімі намаганнямі і затратамі.*

Нават у еўрапейскіх краінах, якія ўжо больш за два дзесяцігоддзі таму задумаліся пра «пластыкавую» праблему, не ўсё ідэальна. У Германіі, напрыклад, 16-17 % насельніцтва ўсё роўна не выконваюць вызначаных заканадаўствам правілы па выкарыстанні пэўных відаў адходаў, заўважыў ён:

— *Праблема палімернага забруджвання сёння — гэта не толькі пластыкавая ўпакоўка вырабаў. Да 4,5 % у адходах Беларусі складае тэкстыль — выкарыстанае адзенне. А гэта таксама сінтэтычныя матэрыялы, якія забруджваюць наваколле і ствараюць мікрапластык. Мікраваломкі ўжо знаходзяць у мясе рыб, птушак, жывёл і нават чалавека. Такім чынам пытанне вяртаецца да таго, каб не толькі абмежаваць, але і правільна арганізаваць збор і перапрацоўку. Без удзелу кожнага гэтую задачу не вырашыць.*

Намаганнямі толькі дзяржавы і абмежавальных мер праблему не вырашыць, бо гэта будзе вялікай нагрузкай на бюджэт, і далёка не кожная краіна здольная праводзіць такія праграмы, падкрэсліў Іван Бараноўскі:

— *Сёння ў Беларусі плата за збор і захоўванне адходаў досыць малая (у сталіцы, напрыклад, вываз 1 м³ смецця каштуе крыху больш за 9 рублёў у дамах без смеццеправода. —* ***Аўт.****). У той жа Германіі яна складае ад 80 да 200 еўра ў год на чалавека. Зыходзячы з гэтага, зразумелы механізм і магчымасць рэалізоўваць нейкія праграмы па барацьбе з пластыкавым забруджваннем. Калі такога няма, то прыходзіцца разлічваць толькі на спажыўца.*

Што датычыцца окса- і біяраскладальнага пластыку, то тут існуе высокая ступень небяспекі для любой краіны, бо на постсавецкай прасторы няма сістэмы сертыфікацыі і ідэнтыфікацыі такіх пластыкаў. Няма акрэдытаванай лабараторыі, органа па сертыфікацыі. Набываючы ў краме пластык, верыць надпісам, што ён біяраскладальны ці экалагічна бяспечны, цяжка, лічыць Іван Бараноўскі. У Беларусі існуе толькі адна група кампаній, якая працуе і вырабляе біяраскладальныя матэрыялы і ўпакоўку. Наколькі біяраскладальнае астатняе — пытанне. Таму НАН Беларусі займаецца работай па стварэнні органа па сертыфікацыі, а найперш — адпаведнай лабараторыі па выпрабаваннях біяраскладальнай упакоўкі.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

Асяроддзе

# QR-код для метасеквоі

## У гэтым годзе на Гродзеншчыне будзе высаджана не менш 50 тысяч дрэў і кустоў

**Аб'ёмы азелянення ў рэгіёне не зніжаюцца. Высаджваць зялёныя насаджэнні ў хуткім часе пачнуць брыгады рамонтна-будаўнічага прадпрыемства «Зелянбуд», прадстаўнікі маладзёжных і грамадскіх арганізацый, валанцёры. Прыняць удзел у акцыях можа кожны. Напрыклад, у абласным цэнтры плануецца высадзіць чатыры тысячы дрэў і дзве тысячы кустоў. Разам з традыцыйнымі пародамі ў Гродне пачалі з'яўляцца і нязвыклыя для нашых мясцін расліны.**



### Азеляніць мікраараёны

Гродна заўсёды лічыўся зялёным горадам. Але аказалася, што гэта не так. Навукоўцы падлічылі, што працэнт азелянення дрэвамі і кустамі не дасягае патрэбных 50 працэнтаў плошчы. Таму стаіць задача выправіць сітуацыю. Вядома, гэты прабел імкнуцца ліквідаваць спецыялісты адпаведных прадпрыемстваў. Але і самі жыхары не стаяць убаку. Кожны сезон праводзяцца шматлікія акцыі па пасадцы дрэў і кустоў.

Як паведамілі ў абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, на вяснова-асенні перыяд сёлетняга года на Гродзеншчыне запланавана пасадка амаль дзевяці тысячы дрэў і такой жа колькасці кустоў. Азеляненне тэрыторый ажыццяўляецца ў рамках экалагічных акцый, ініцыятыў жыхароў і ў адпаведнасці з зацверджаным Планам мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі.

Па прагнозах эколагаў, работы па азеляненні тэрыторый па аб'ёмах і колькасці насаджэнняў не будуць зніжацца. Мяркуецца, што сёлета ўдасца дасягнуць леташняга ўзроўню, гэта значыць, высадзіць не менш чым паўсотні тысяч дрэў і кустоў.

У лясгасах і спецыялізаваных прадпрыемствахназапашаны пасадачны матэрыял. Размеркаваны і зоны пасадак. Брыгады «Зелянбуда» ў хуткім часе пачнуць масавыя выезды на вуліцы абласнога цэнтра. Асаблівая ўвага — спальным мікраараёнам, тэрыторыям індывідуальнай забудовы, а таксама




аб'ектам, якія здадзены альбо рыхтуюцца да здачы ў эксплуатацыю. Гэта датычыцца ў першую чаргу аб'язных дарог, транспартнай развязкі на трасе М6. Азеляненне будзе весціся на тэрыторыі паркавых зон і сквераў.

### Гінкго і паўлоўнія

Экзатычныя расліны не высаджваюцца такімі алеямі, як, напрыклад, бярозы, клёны ці каштаны. Гэта адзінкавыя экзэмпляры пераважна ў цэнтральным парку Гродна. Аматарам гэтай справы можна назваць **доктара біялагічных навук, загадчыка кафедры батанікі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Алега СОЗІНАВА.** Ён расказаў, што некаторыя экзэмпляры прывёз з Санкт-Пецярбурга. Так у Гродне з'явілася ўнікальнае хвойнае дрэва гінкго. Унікальнасць гродзенскага гінкго ў тым, што яно вырасла з насення 850-гадовага гінкго ў Японіі, гэта значыць, мае сваю цікавую радаслоўную.

Сёлета ў парку з'явілася метасеквоя — разнавіднасць хвойнай секвоі — таксама рэдкі для нашых мясцін экзэмпляр. Як і гінкго, дрэва было шырока распаўсюджана ў эпоху дыназаўраў, а да нядаўняга часу лічылася зніклым. Сёння расце пераважна ў Цэнтральным Кітаі і дасягае 40 метраў. Метасеквоя можа расці да 600 гадоў. Дрэва высаджана гродзенскімі энергетыкамі, агароджана і суправаджаецца прыгожым інфармацыйным шкляным стэндам. У яго QR-кодзе зашыфраваны звесткі, якія якраз і сабраны навукоўцамі-батанікамі ГрДУ імя Я. Купалы.



На думку Алега Созінава, такія інфармацыйныя табліцы варта размясціць вакол кожнага экзатычнага дрэва. Мала хто ведае, што ў цэнтральным гарадскім парку імя Жылібера растуць рэдкія віды дрэў — айва, магонія, пэтлея, лапіна, дэйцыя, яблыня «Зібальда» і іншыя экзоты. Непадалёку, у Швейцарскай даліне, высаджана паўлоўнія. Ёсць у парку цюльпанавае дрэва, але яно пакуль не цвіце. Таксама варта звярнуць увагу ў інфармацыйным плане і на векавыя дрэвы, лічыць навуказнавец. А такіх тут нямала. Цікавае відовішча ўяўляе вялізны пень, праз які расце маладое дрэва. Мала хто ведае, што стары ясень — равеснік парку, які быў закладзены больш за 200 гадоў таму. Праўда, захаваць дрэва не ўдалося, але яго рэшткі таксама дыхаюць гісторыяй.

— Гэтай гісторыі не хапае цэнтральнаму парку, яго варта дапоўніць інфармацыйнымі даведкамі. Каб і гродзенцы, і госці горада маглі з дапамогай такіх жа QR-кодаў, як каля метасеквоі, атрымаць звесткі аб рэдкіх і найбольш узроставых дрэвах. Бо яны — таксама помнікі, але жывыя, помнікі прыроды і былых часоў. Інфармацыя аб іх будзе ствараць добры турыстычны імідж гораду.

Ёсць цікавыя экзэмпляры на Алеі сяброўства, у Калажскім парку. Звыш ста відаў і сартоў раслін можна ўбачыць у дэндрарыі каля Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта.

### Утульны двор

Не застаюцца ўбаку ад «зялёнай» тэмы жыхары шматпавярховак. Дзякуючы ім, гарадскія двары становяцца больш прыгожымі і ўтульнымі. У абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў падказалі адзін з такіх адрасоў: камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання пры ЖЭСе № 11. Старшыня камітэта Наталля Сасім расказала, што жыхары самі вырашылі азеляніць свой двор. Праінфармавалі аб гэтым кіраўніцтва ЖЭСа, параіліся з ландшафтным дызайнерам прадпрыемства «Зелянбуд». Закупілі туі, не пашкадавалі сродкаў на іншыя экзатычныя і дэкаратыўныя расліны. У спецыяльным гадавальніку заказалі саджанцы яблыні. І заклалі міні-парк. Атрымалася вельмі ўтульна.

— Каля пад'езда пасадзілі туі, дрэвы, кветкі. Ініцыятарамі сталі жыхары першага паверха. Па іх просьбе ў ЖЭСе зрабілі металічную агароджу, — расказвае **старшыня КТГСа Наталля САСІМ.** — Трэба даводзіць справу да канца. Мала пасадзіць, трэба яшчэ стварыць раслінам больш-менш бяспечныя ўмовы для росту.

Аказалася, што людзі гатовы падтрымаць добрую справу. Вось і ў суседнім двары вясной вырашылі зрабіць каля пад'езда зялёны куток. Справу не сталі адкладваць, дружна сабраліся і вырашылі выдаткаваць на гэтыя мэты па 25 рублёў з кватэры. Для сямейнага бюджэту сума не адчувальная, а ў справе азелянення атрымаўся даволі прыгожы вынік. На гэтыя сродкі закупілі рознай расліннасці. Параіліся з ландшафтным дызайнерам. Той не толькі з выбарам раслін дапамог, але і падказаў, дзе і як размясціць іх вакол пад'езда. Быў складзены падрабязны эскіз, кажа Наталля. Узгаднілі з жыхарамі, якія, дарэчы, самі і высадзілі дэкаратыўныя расліны. Атрымаўся сапраўдны дэндрарый.

— У людзей прачынаецца інтарэс да агульнай справы, — кажа Наталля. — Яны сапраўды хочуць зрабіць утульнымі не толькі свае кватэры, але і двары. І такіх прыкладаў нямала. На такія дамы трэба раўняцца і іншым жыхарам.

Увогуле, справа азелянення знаходзіцца на кантролі КДК Гродзенскай вобласці. Адна з нядаўніх калегій была прысвечана гэтаму пытанню. У прыватнасці, гаворка ішла аб тым, каб не толькі выканаць планавыя пасадкі зялёных насаджэнняў, але і забяспечыць ім адпаведны догляд за імі. Важна, каб дрэвы прыжыліся, асабліва елкі. Інакш неэфектыўна выкарыстоўваюцца бюджэтныя сродкі.

А між тым дрэвы займаюць важнае месца ў жыцці чалавека. І не толькі ў плане «зялёных» лёгкіх гарадоў. Вучоныя правадзілі даследаванні і выявілі, што там, дзе больш зеляніны, там людзі менш агрэсіўныя. А там, дзе толькі шкло, бетон, вострая



геаметрыя, — канфліктнасць вышэйшая. На псіхіку чалавека вельмі станоўча ўплывае разнастайнасць зялёных адценняў дрэвавых кронаў. Дрэвы супакойваюць, аптымізуюць разумовы працэс, маюць антыдэпрэсіўны эфект, паляпшаюць настрой.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Акцыя

# «Адновім лясы разам!» — пасадзі сваё дрэва

**На працягу дня валанцёры змогуць дапамагчы работнікам лясной гаспадаркі ў аднаўленні ветравальна-буралломных участкаў. Толькі сёлета ў выніку непагадзі пацярпела больш за тры тысячы гектараў ляснога фонду. Яго неабходна аднавіць цягам трох гадоў, інфармуе прэс-служба Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Як дадалі там, кліматычныя ўмовы, што змяніліся, раз-пораз выпрабоўваюць лес на трываласць. У мінулым годзе добраахвотнікі ўжо дапамагалі лесаводам у аднаўленні ветравальна-бураломных участкаў у Магілёўскай вобласці. Тады сіламі неабыякавых грамадзян на працягу тыдня было высаджана больш за 6,5 мільёна дрэў. Сёлета акцыя мяняе свой фармат: яна ахопіць усе рэгіёны нашай краіны і адбудзецца ў адзін дзень — 21 кастрычніка.

Сімвалічна, што ў гэты дзень у краіне будзе таксама святкавацца Дзень бацькі. Як вядома, народная мудрасць абвяшчае, што кожны сапраўдны мужчына павінен у сваім жыцці зрабіць тры рэчы: пабудаваць дом, пасадзіць дрэва і выгадаваць сына. Акцыя «Адновім лясы разам!» дасць магчымасць кожнаму беларусу як мінімум выканаць адзін свой абавязак: паклапаціцца аб прыродзе.

Усіх ахвотных запрашаюць прыняць удзел у акцыі. Для гэтага трэба звярнуцца ў найбліжэйшы лясгас ці лясніцтва і заявіць аб сваім жаданні. Са свайго боку лесагаспадарчыя ўстановы як заўсёды забяспечаць валанцёраў неабходным пасадачным матэрыялам і інвентаром.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НАРОДНАЯ ФІТАТЭРАПІЯ

## Прырода выратуе ад прастуды і грыпу?

**Калі вы запасліся зёлкамі і лісцем яшчэ ў гарачыя летнія дні і насушылі іх у запас, вы малайцы — не трэба было быць празарліўцам летам, каб прадбачыць новы сезон вірусаў з прыходам восені.**

Калі ж, падобна аўтару гэтых радкоў, вы нічога не збіралі, не сушылі на гарышчы і не рассыпалі па слоічках і скрыначках — на дапамогу прыходзяць больш дальнабачныя бацькі і сваякі. Або аптэкі. Зёлкі, вядома, не панацэя і супрацьвірусных прэпаратаў не заменяць, але цалкам здольныя быць эфектыўнай прафілактыкай ВРВІ і грыпу, падтрымаць імунітэт і нават здольныя спыніць прастуду на пачатковым этапе. Або стаць добрым дадаткам да фармакалагічнага лячэння.

На сезонных рынках, магчыма, вам траплялiся сціплыя прылаўкі з сухімі традыцыйнымі для нашых шырот прыправамі (кмен, каляндра, сушаны часнок), кропам, пятрушкай і іншымі смакавымі травамі. Там жа часам цяпер прадаюць і сухое лісце малін, ажын, мяту, чабор. Гандлююць сухім лісцем і гаючымі траўкамі па восені, здараецца, і на абсталяваных міні-рынках каля аўтатрас. Гандлёвыя месцы з зёлкамі і лісцем не настолькі папулярныя ў пакупнікоў, як, напрыклад, тыя, дзе прадаюць каўбасы ці прыгажуны баравікі, але і сюды кіруюць людзі. Падыходзяць, пытаюцца і купляюць. Зацікавілася і я.

### У БАБУЛІ ЦІ Ў АПТЭЦЫ?

— Травы — гэта і лячэнне, і прафілактыка. Але калі, напрыклад, вам патрэбна неадкладная аперацыя, чым жа травы тут дапамогуць? Праўда, у зёлак ёсць галоўная перавага перад лекамі: часам па розных прычынах таблетак можа не апынуцца пад рукой, а травы атачаюць нас заўсёды. Галоўнае — ведаць, якія травы дапамогуць, — ахвотна ўступае ў размову пажылая жанчына за прылаўкам.

— У мяне тут нічога асаблівага, — распавядае яна. — Лісце лясных і «хатніх» малін, ажын, суніц, таксама лясных і садовых. Лісце лясных суніц пры кашлі добра дапамагае. Ёсць каліна: і лісце, і ягады. Таксама выдатны сродак ад прастуды. Кветкі ліпы, рамонак, шалфей. Амаль усё вырошчваю на сваім агародзе. Гэтак яшчэ мая мама рабіла. Ліпу толькі збіраю ў лесе, ды яшчэ лісце лясных суніц і малін.

Яна кажа, нейкай цудадзейнай травы, як часам думаюць гарадскія жыхары, няма ў прыродзе. І быць не можа. Калі фітасродак падабраны правільна, ён дапаможа ад вызначанай хваробы — і будзе цалкам «цудадзейным».

— Наогул, травы лепш купляць у аптэках або фітаптэках, — каментуе **валеолаг Лілія КАЦЕР.** — У прыватных асоб набываць сухія лекавыя травы я не рэкамендавала б. Выключэннем можа стаць выпадак, калі вы асабіста добра ведаеце чалавека і давяраеце яму. У аптэках фітасыравіна сабрана і высушана правільна і ў патрэбныя тэрміны, да таго ж яна правільна захоўвалася. Плюс у кожнага фітапрэпарата ёсць тэрмін прыдатнасці — гэта таксама важна не забываць.

Ці можна вылечыцца ад ВРВІ толькі зёлкамі? Пры лёгкім цячэнні хваробы і моцным імунітэце — так, кажуць медыкі. Але лепш усё ж не рызыкаваць, бо ковід, напрыклад, часта пачынаецца як ВРВІ, а травой яго (як і сучасныя штамы грыпу) наўрад ці вылечыш.

— Праверанымя часам травы ад прастуды сапраўды бываюць вельмі эфектыўныя, асабліва на пачатковых стадыях захворвання, ад тэмпературы, рыніту, кашлю. Але важна правільна іх камбінаваць і прымаць. І калі вірус ужо ўвайшоў у сілу і асабліва калі з'явіліся ўскладненні, без фармакалагічных сродкаў не абысціся, — кажа Лілія Эдуардаўна.

### ЛІСЦІКІ-КВЕТАЧКІ

Што ж раіць народная медыцына, калі пяршыць і баліць горла, з носа цячэ, вочы



слязяцца, галава цяжкая — словам, вы відавочна прастудзіліся?

Дапаможа, напрыклад, чай з лісця ажын. Сталовую лыжку сухога лісця ажын трэба заліць кіпенем і настойваць дзве гадзіны, потым працадзіць. Піць рэкамендуецца за паўгадзіны да ежы.

Калі даймае кашаль, можна заварыць лісце суніц (лепш за ўсё лясных, раяць траўнікі). Рэцэпт такі: сталовая лыжка лісця лясных суніц, тры сталовыя лыжкі лісця ажын. Можна дадаць чайную лыжку сухой здробненай фіялкі трохкаляровай. Заліць шклянкай кіпеню, настойваць 20 хвілін (лепш у тэрмасе), працадзіць. Піць такі сродак рэкамендуецца двойчы ў дзень па шклянцы, кожны раз заварваючы свежы настой.

Зразумела, кажучы аб фіталячэнні прастуды і грыпу, нам ніяк не атрымаецца абысці ўвагай маліну. Тое, што малінавае варэнне — галоўныя салодкія лекі ад ВРВІ, ведаюць усе: ад малых да дарослых. Але і лісце, і нават малінавыя галінкі валодаюць выяўленым тэрапеўтычным эфектам. Калі вы былі ў кантакце з калегам, які чхае і кашляе, прыйшоўшы дадому, здрабніце малінавыя галінкі з лісцікамі і заліце паловай літра кіпеню. Настойваць усё гэта, зноў жа, лепш у тэрмасе, трыццаці хвілін будзе дастаткова. Працадзіце і дадайце сок аднаго невялікага лімона. Здрабніце два буйныя зубкі часнаку і дадайце ў настой. Пажадана яшчэ размяшаць у шклянцы з гэтай сумессю чайную лыжку мёду. Піць адвар рэкамендуецца перад сном, у ложку, як чай і замест яго.

Дарэчы, пра чай: да заваркі таксама можна дадаць траву, каб прыгатаваць *«прафілактычны восеньска-зімовы чай»* ад прастуды і грыпу. Калі на вас «начхаў» спадарожнік у метро або калега ўвесь дзень смаркаўся за суседнім сталом і адпрасіўся раней, тады, прыйшоўшы дадому, вазьміце 200-250 г чаю, дадайце 2 ст. л. мяты і столькі ж сухога святаянніку, а таксама сталовую лыжку чабору, можна яшчэ дадаць такі ж аб'ём здробненага кораня валяр'яны. Прыгатаваную сумесь ссыпаем у непразрыстыя посуд і шчыльна закрываем.



**Зёлкі, вядома, не панацэя і супрацьвірусных прэпаратаў не заменяць, але цалкам здольныя быць эфектыўнай прафілактыкай ВРВІ і грыпу, падтрымаць імунітэт і нават здольныя спыніць прастуду на пачатковым этапе. Або стаць добрым дадаткам да фармакалагічнага лячэння.**



На адзін раз патрэбна толькі адна чайная лыжка «супрацьпрастуднай заваркі». Заліваем яе шклянкай кіпеню і даём настаяцца хвілін дзесяць. П'ём увечары. Можна дадаць у шклянку лыжачку мёду.

### І ІНШЫЯ ДАРЫ ПРЫРОДЫ

А збіць тэмпературу, аказваецца, можа дапамагчы звычайная бульба. Буйную бульбіну надзіраем на тарцы, змешваем са сталовай лыжкай яблычнага воцату і з гэтай кашыцай робім кампрэсы на лоб хворага.

— Ці сапраўды такія кампрэсы могуць валодаць гарачкапаніжальным эфектам? — вырашыла я ўдакладніць у валеолага Ліліі Кацер.

— Пэўны эфект будзе, у першую чаргу так званы эфект плацэба. І, мусіць, памятаць такія народныя рэцэпты (з таго, што пад рукой) варта на ўсякі выпадак — ніколі ж не ведаеш напэўна, у якія сітуацыі можа паставіць жыццё. Але, калі тэмпература высокая, я раіла б усё ж такі мець у аптэчцы гарачкапаніжальныя прэпараты, напрыклад той жа парацэтамол, — кажа Лілія Эдуардаўна.

Яшчэ адзін старадаўні рэцэпт пры прастудзе — *кісель з прарошчаных зерняў аўса.* Як прарошчваць авёс, ведае, напэўна, у нашы дні практычна кожны: прарошчанае зерне як супервітамінны дадатак у салаты — візітная картка правільнага харчавання на працягу апошняга дзесяцігоддзя. Для тых, хто ўсё ж не ў курсе: спосабаў шмат, але прасцей за ўсё прарасціць авёс у вільготнай марлечцы на спадачку. Дык вось, парослыя зярняткі (з парасткамі 1-3 мм) перамолваем і 1 ст. л. атрыманай сумесі заліваем шклянкай халоднай загатаванай вады. Даводзім да кіпення на павольным агні і кіпяцім дзве хвіліны. Укручваем і настойваем 15-20 хвілін. Піць такі кісель абавязкова свежапрыгатаваным, па 100 мл тройчы на дзень за паўгадзіны да ежы. Для смаку і павелічэння эфекту ў яго рэкамендуюць дадаваць 1-2 ч. л. ліпавага мёду (або любога іншага мёду, але ліпавы — прызнаны народны сродак ад прастуды).

— Прарошчаны авёс сапраўды ўтрымлівае элементы, якія актыўна ўздзейнічаюць на кашаль і ў цэлым дапамагаюць хутчэй выздараўлівацъ пры прастудзе, — каментуе Лілія Кацер. — Народныя сродкі з гэтым інгрэдыентам разрэджваюць макроту і спрыяюць адхаркванню, зніжаюць колькасць прыступаў кашлю. Але важна памятаць, што гэтыя сродкі маюць супрацьпаказанні, галоўнае з якіх — наяўнасць алергіі. І нават калі яе ў вас няма, ужываць такі кісель больш за 10 дзён я не рэкамендавала б.

*Сок каліны з мёдам* — такі ж агульнавядомы народны сродак ад прастуды, як і гарбата з ліпай. Сок і мёд злучаюць у прапорцыі 50 на 50 і сталовую лыжку сумесі прымаюць тройчы на дзень. Як нескладана здагадацца, за паўгадзіны да ежы: гэта стандартная рэкамендацыя, калі гаворка ідзе аб фіталячэнні. Справа ў тым, што на пусты страўнік любая сумесь засвоіцца лепш.

Ну, і, вядома, не пакінем па-за сваёй увагай цыбулю — куды без яе, калі гаворка ідзе аб прастудзе? Калі паўкіло цыбулі прапусціць праз мясарубку, дадаць 6-7 лыжак мёду і шклянку цукру, заліць літрам вады і варыць на павольным агні дзве гадзіны, атрымаецца не «цыбульнае варэнне», а народны сродак ад кашлю. Застаецца астудзіць, працадзіць і захоўваць у халадзільніку. Па меры неабходнасці піць тройчы на дзень за паўгадзіны да яды, па сталовай лыжцы.

— Цыбуля сапраўды змяшчае фітанцыды, якія эфектыўна змагаюцца з прастуднымі і віруснымі захворваннямі, — каментуе Лілія Кацер. — Медыкі выкарыстоўвалі цыбулю яшчэ ў антычнасці, у часы Гіпакрата. Акрамя таго, цыбуля багатая вітамінамі, што дапамагае арганізму аднавіцца ў працэсе і асабліва — пасля хваробы. Цыбуля мае выяўлены бактэрыцыдны эфект, валодае адхарквальным дзеяннем, змагаецца з кашлем, як сухім, так і вільготным. Іншая справа, што цеплавая апрацоўка знішчае шматлікія карысныя ўласцівасці цыбулі. Хоць не ўсе. Сапраўды, «цыбульнае варэнне» можа мець і супрацьзапаленчы, і супрацьацёкавы эфект (здыме ацёк дыхальных шляхоў), і бактэрыцыднае дзеянне. Але я ўсё ж раіла б ужываць цыбулю ў ежу ў свежым выглядзе і без цукру — эфект будзе большы. Звярніце ўвагу, цыбуля добрая як дапаможны і падтрымлівальны сродак, а таксама як мера прафілактыкі. Аднак не варта замяняць цыбуляй прызначаныя ўрачом лекі і тэрапію.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### ИНФОРМИРУЕТ о проведении повторного аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому городскому филиалу Гродненского областного потребительского общества

**Аукцион состоится 31.10.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-28153 (назначение – здание специализированное розничной торговли; наименование – магазин), площадью 101,8 кв. м, с охранной сигнализацией, инв. № ГР0000028; пожарной сигнализацией «Молния» инв. № А01000501; пожарной сигнализацией, инв. № А00000218, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Понемуньская, 10.** **ЛОТ № 1** расположен на земельном участке, кадастровый № 422088008601000027, площадью 0,0297 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), находящемся по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Понемуньская, 10. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель в виде: земли, находящиеся в водоохранных зонах вне прибрежных полос, код – 2, площадью – 0,0297 га; ограничения (обременения), устанавливаемые в отношении недвижимого имущества, находящегося в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадь – 0,0051 га |
| **Начальная цена продажи** | 67 416,32 руб. (шестьдесят семь тысяч четыреста шестнадцать рублей тридцать две копейки) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 6 741 руб. (шесть тысяч семьсот сорок один рубль) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 27.10.2023 г. до 15.00** |
| **Условия проведения аукциона** | 1. Оплату за приобретаемый объект производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь. 2. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя. 3. Право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». 4. Документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/

---

**Центр Промышленной Оценки**
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: оборудование, бывшее в употреблении, расположенные по адресу: Брестская область, Березовский р-н, Березовский с/с, 7**

| Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|
| **Лот № 1** – станок для раскроя алюминиевого профиля тип 2S85N-S, шифр 44500 | **9 240,00** |
| **Лот № 2** – станок форматный круглопильный «Hydro 3200», шифр 44502 | **13 320,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 7 рабочих** дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **3** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 0,6 % от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Передача предмета аукциона победителю торгов (единственному участнику), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости имущества.
Победитель электронных торгов осуществляет расходы, связанные с заключением договора купли-продажи, демонтажом, погрузкой и транспортировкой имущества

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.04.2023 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: в 11.00 30.10.2023 до 12.00 30.10.2023.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок: по 27.10.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

---

**Центр Промышленной Оценки**
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**
Адрес**: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 98Д**

**Магазин – 756,5 кв. м,** инв. № 640/С-111245.
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,3632** га, предоставлен на праве аренды (срок действия по 28.12.2034) для обслуживания здания магазина. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: охранная зона ЛЭП напряжением до 1000 В (пл. 0,0303 га)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 472 800,00 бел. руб.**

**Лот № 2**
Адрес**: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 125/1**

**Сарай** – **53,4 кв. м,** инв. № 640/С-115118 (назначение: здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности: уборная).
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0362** га, предоставлен на праве аренды (срок действия по 16.02.2044) для строительства и обслуживания сарая.
Ограничения (обременения): водоохранная зона водных объектов р. Случь, охранная зона линий электропередачи ЛЭП до 1000 В

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 26 760,00 бел. руб.**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Оплата лотов (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение **10 (десяти)** рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение по лоту № 1 – 2 %, № 2 – 7 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов.

Предыдущее извещение по лоту № 1 опубликовано в газете «Звязда» от 23.08.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.11.2023 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.11.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

---

## РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

### извещает о проведении 22.11.2023 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1**. 1/2 доля в праве собственности на капитальное строение с инвентарным номером: 600/С-111428 (назначение – садовый, дачный домик (дача), наименование – садовый домик), общей площадью – 102,8 кв. м, с составными частями и принадлежностями: двухэтажный каркасно-засыпной садовый домик, состоящий из первого и мансардного этажей, с цокольным этажом (А2/кз), пристройкой 1, уборной 2, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623685200013000176 по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Острошицко-Городокский с/с, СТ «Здоровье-81», II-113. **Начальная цена продажи – 70 380,00 бел. руб., задаток – 7 038,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2**. 1/2 доля в праве собственности на капитальное строение с инвентарным номером 620/С-14589 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом), общей площадью – 27,4 кв. м, с составными частями и принадлежностями: одноэтажный бревенчатый дом А1/д с дощатой верандой 1, бревенчатой пристройкой 2, двумя дощатыми 3,5, одним бревенчатым 4 сараями, дощатой уборной 7, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622282003101000113, по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Дзержинский р-н, Добриневский с/с, д. Добринево, д. 35. **Начальная цена продажи – 11 160,00 бел. руб., задаток – 1 116,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3**. 1/2 доли в праве собственности на земельный участок с кадастровым номером 624482500010000101 (назначение – земельный участок для коллективного садоводства, наименование – земельный участок для коллективного садоводства), площадью 0,1231 га, расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Голоцкий с/с, СТ «Росинка», участок № 40. **Начальная цена продажи – 7 380,00 бел. руб., задаток – 738,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4**. 1/2 доли в праве собственности на земельный участок с кадастровым номером 625681300001000192 площадью 0,0119 га, расположенный по адресу: Минская обл., Узденский район, Слободской с/с, СТ «Сосна», д. 73. **Начальная цена продажи – 250,00 бел. руб., задаток – 25,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5**. Объект недвижимости в составе: 1/2 доли в праве собственности на капитальное строение с инвентарным номером 623/С-7403 (назначение – садовый, дачный домик (дача), наименование – садовый домик), общей площадью 90,2 кв. м, с составными частями и принадлежностями: двухэтажный бревенчатый садовый домик – А1/д с дощатым мансардным этажом – (А2/д), дощатым сараем – 1, дощатой уборной – 2, двумя навесами, скважиной, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625681300001000091 по адресу: Минская обл., Узденский район, Слободский с/с, СТ «Сосна», д. № 73; 1/2 доли в праве собственности на земельный участок с кадастровым номером 625681300001000091 по адресу: Минская область, Узденский р-н, Слободской с/с, СТ «Сосна», 73. **Начальная цена продажи – 15 400,00 бел. руб., задаток – 1 540,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Изолированное помещение с инвентарным номером 430/D-7271, наименование – квартира, назначение – квартира, общей площадью 48,5 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Новогрудский район, Валевский с/с, д. Новосады, ул. Центральная, 45-5. **Начальная цена продажи – 9 450, 00 бел. руб., задаток – 945,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** 1/4 доля в имущественном праве на объект недвижимости – изолированное помещение с инвентарным номером 320/D-7943; назначение – Квартира; наименование – Квартира, состоящая из трех жилых комнат, кухни, коридора, ванной, туалета, лоджии, кладовой в подвале, расположенная на восьмом этаже девятиэтажного панельного дома; общей площадью жилого помещения 66,6 кв. м; число комнат – 3; адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, м-н 16-й, д. 25, кв. 101. **Начальная цена продажи – 18 990,00 бел. руб., задаток – 1 899, 00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 642/С-31697, расположенное на земельном участке площадью 2,4274 га с кадастровым номером 622850100001002479 по адресу: Минская обл., Копыльский район, г. Копыль, ул. Партизанская, 33А/1. Площадь – 265,1 кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж. Составные части и принадлежности: одноэтажное нежилое здание Б1/к. **Начальная цена продажи – 42 087,60 бел. руб., задаток – 4 208,76 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9**. Изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-164507 расположено по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Пушкина, 11, площадь – 16,0 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение. **Начальная цена продажи – 23 932,80 бел. руб., задаток – 2 393, 28 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** 1. Капитальное строение с инвентарным номером № 202/С-236, площадь – 66,8 кв. м, назначение – здание специализированное складов, наименование – склад, расположенное на земельном участке общей площадью 0,2345 га с кадастровым номером 223055100004000055 по адресу: г. п. Лиозно, ул. Комсомольская, 46/1.

2. Капитальное строение с инвентарным номером № 202/С-241, площадь – 5,7 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – будка, расположенное на земельном участке общей площадью 0,2345 га с кадастровым номером 223055100004000055 по адресу: г. п. Лиозно, ул. Комсомольская, 46/2.

3. Капитальное строение с инвентарным номером № 202/С- 242, площадь – 68,1 кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание гаражей, расположенное на земельном участке общей площадью 0,2345 га с кадастровым номером 223055100004000055 по адресу: г. п. Лиозно, ул. Комсомольская, 46/3.

4. Капитальное строение с инвентарным номером № 202/С-237, площадь – 75,4 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ наименование – склад, расположенное на земельном участке общей площадью 0,2345 га с кадастровым номером 223055100004000055 по адресу: г. п. Лиозно, ул. Комсомольская, 46/4 (с составной частью и принадлежностью: 1 – навес).

5. Капитальное строение с инвентарным номером № 202/С-239, площадь – 2,4 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – уборная, расположенное на земельном участке общей площадью 0,2345 га с кадастровым номером 223055100004000055 по адресу: г. п. Лиозно, ул. Комсомольская, 46/5.

6. Составные части и принадлежности, являющиеся общими приналдежностями капитальных строений с инв. номерами 202/С-236, 202/С-237, 202/С-239, 202/С-241, 202/С-242: б – проезжая часть, в – ограждение, участок 2, участок 1, г – калитка, а – ворота, д – калитка. **Начальная цена продажи – 98 143,20 бел. руб., задаток – 9 814,32 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-37775 (назначение – здание специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование – материальный склад), площадью 207,7 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620450100001000191 по адресу: Минская область, Березинский район, г. Березино, ул. Мультана, 62/Б2. Составные части и принадлежности: одноэтажное бревенчатое здание материального склада А/д. **Начальная цена продажи – 9 504,00 бел. руб., задаток – 950,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 22.11.2023 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27 в рабочие дни: пн. – чт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00, пт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 15.00.

**Окончание приема заявлений – 17.11.2023 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **22 ноября 2023 года**.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 44 763 62 63; +375 17 395 95 21.**

Ад пачатку свету

# ТЭКТАНІЧНЫЯ ПЛІТЫ ЎЗДЫМАЮЦЦА...

## На Эверэсце выявілі астанкі марскіх драпежнікаў



**Спецыялісты з Інстытута пазваночнай палеанталогіі і палеаантрапалогіі Акадэміі навук Кітая выявілі на тэрыторыі Тыбецкага аўтаномнага раёна на Эверэсце (Джамалунгме) закамянелыя астанкі дзвюх асобін старажытнага глыбакаводнага драпежніка гімалаязаўра ўзростам 215-212 мільёнаў гадоў. Пра гэта паведаміла агенцтва «Сіньхуа».**

Астанкі былі знойдзены на вышыні чатырох тысяч метраў над узроўнем мора, за сто кіламетраў ад лагера альпіністаў. Закамянеласці ў выніку руху тэктанічных пліт былі паднятыя з дна акіяна і апынуліся высока ў гарах, адзначаюць спецыялісты.

Навукоўцы распавялі, што марскія драпежнікі мелі падоўжаную пашчу і вострыя зубы, іх даўжыня была каля дзесяці метраў. Харчаваліся яны ў асноўным рыбай і бесхрыбетнымі.

Цяпер 170 вучоных праводзяць даследаванне вады і экалагічнай абстаноўкі на Эверэсце. Гара размешчана на Цінхай-Тыбецкім сугор'і, вядомым як «Дах свету» і «Воданапорная вежа Азіі». Экспедыцыя мае вялікае значэнне для вывучэння ўздзеяння змянення клімату і навакольнага асяроддзя ў раёне Эверэста на іншыя часткі свету.

Тэхналогіі будучыні

# ЦАЛКАМ ХАТНЯЯ «НЯНЬКА»

## З'явілася жыллё, якое размаўляе з дзецьмі і жывёламі

**У Расіі распрацавалі сістэму разумнага дома, якая дазваляе па аўдыясувязі размаўляць з дзецьмі і хатнімі жывёламі. Пра гэта «Известиям» паведамілі ў дэвелаперскай групе «Аквілон».**

Функцыя аддаленай аўдыясувязі дазваляе звязацца з дзіцем, калі яно не чуе званка тэлефона і не бярэ трубку, — сістэма ў кватэры зможа прыцягнуць яго ўвагу і папрасіцьператэлефанаваць бацькам, распавялі ў кампаніі. Акрамя таго, сістэма inHOME дазваляе аддалена адключыць разеткі, а датчыкі дыму і працёкаў аўтаматычна паведамяць аб няштатнай сітуацыі ў кватэры бацькам і ў дыспетчарскую.

«Сем'і з дзецьмі — асноўная аўдыторыя пакупнікоў новабудоўляў, і звычайна гэта эканамічна актыўныя сем'і, у якіх бацькі шмат працуюць. Для малых часта наймаюць няньку або прыцягваюць бабуль і дзядуль. Аднак ужо з 10-12 гадоў многія дзеці пасля школы бавяць час адны дома», — адзначыў дырэктар маскоўскага дэпартамента групы «Аквілон» Дзмітрый Рагатых.

Таксама многія карыстальнікі праяўляюць цікавасць да функцыі аўдыясувязі з хатнімі гадаванцамі, паведамілі ў кампаніі.

«Прынята лічыць, што больш складана спраўляюцца з адзінотай сабакі. Аднак даследаванне амерыканскіх і бразільскіх навукоўцаў 2020 года выявіла, што кошкі таксама цяжка пераносяць адзіноту. Так, праблемы ў паводзінах часцей выяўляюцца ў кошак, якія застаюцца адны пяць-сем разоў на тыдзень і больш за шэсць гадзін у дзень», — распавялі там.




Па словах зоапсіхолага Мірослава Волкава, жывёлы будуць рэагаваць на голас гаспадара, хоць цалкам замяніць адносіны з гадаванцам без рэальнага кантакту аўдыясувязь не зможа. Карысная функцыяй для гаспадароў стане камера відэаназірання, якую можна інтэграваць у сістэму.

«Звычайна я рэкамендую такія камеры для назірання за жывёламі без уладальнікаў. Відэаназіранне дапаможа вам, калі вы едзеце надоўга, напрыклад у адпачынак, і пакідаеце гадаванца на сумленне сяброў ці зоаняньні, якія будуць прыходзіць у кватэру, гуляць з жывёламі і карміць іх», — распавёў эксперт, удакладніўшы, што так у гаспадароў будзе магчымасць аддалена пракантраляваць, як гадаванец сябе паводзіць і адчувае, ці накормлены ён і наколькі спакойна перажывае часовае расстанне.

Каго мы бачым!

# УНІКАЛЬНЫ ІНКЛЮЗ У БУРШТЫНЕ

## Гэта старажытная страказа ўзростам 50 мільёнаў гадоў

**На Калінінградскім бурштынавым камбінаце дзяржкарпарацыі «Растэх» знайшлі рэдкі інклюз, гэта значыць выкапні рэшткаў жывога арганізма, які трапіў у бурштын. Узор балтыйскага каменя захаваў сведчанне свету старажытнай фаўны — далікатную стракозу.**



Знаходка з'яўляецца ўнікальнай, паколькі казурка захавалася не фрагментамі, а цалкам. Гэты інклюз стаў другім падобным за ўсю гісторыю здабычы бурштыну ў Расіі. Па ацэнках спецыялістаў, узрост інклюзу складае каля 50 мільёнаў гадоў. Вага рэдкага каменя — 31 грам, яго памер — 57 на 31 міліметр, таўшчыня — 27 міліметраў.

Як тлумачаць эксперты, інклюзы са стракаюцца выключна ў вонкавых вылучэннях жывіцы — ледзяшах, кроплях і нацёках. Смала з'яўлялася своеасаблівай пасткай: некаторыя казуркі былі занесены туды парывамі ветру, іншыя спакусіліся бліскучай паверхняй смалы, трэція былі захопленыя знянацку кропляй, якая падала з дрэва. Прыліпнуўшы да яе паверхні, яны заліваліся другім і трэцім нацёкамі смалы. У сярэднім старажытныя ўключэнні ўтрымліваюць у сабе не больш за 9 працэнтаў ад усяго празрыстага каменя.

Па словах старшага навуковага супрацоўніка Калінінградскага музея бурштыну, кандыдата біялагічных навук Андраніка Манукяна, падобныя інклюзы сустракаюцца даволі рэдка. Так, у Еўропе бурштынавых камянёў з уключэннем стракоз налічваецца ўсяго 35, з іх 25 знаходзяцца ў музеях Германіі.

«Адзіная да нядаўняга часу «расійская» страказа ў бурштыне была знойдзена каля дзесяці гадоў таму і захоўваецца ў Музеі бурштыну. Апошні інклюз, выяўлены бурштынавым камбінатам, цікавы добрай захаванасцю казуркі і адрозніваецца ад раней знойдзенага відам стракозы», — растлумачыў эксперт.

Інклюзы ўяўляюць адмысловую каштоўнасць для навукі: з іх дапамогай можна выявіць нявывучаныя віды фаўны Зямлі, скласці апісанне эвалюцыйных змяненняў, а таксама вызначыць кліматычныя асаблівасці розных куткоў планеты ў дагістарычныя часы. У агульнай складанасці дзякуючы вывучэнню інклюзаў былі адкрыты больш за тры тысячы відаў насякомых і сотні відаў раслін.

Пласты гісторыі

# ДАГІСТАРЫЧНАЯ ДАРОГА НА ДНЕ

## Яна захавалася дзякуючы марскому глею

**Дарогу, якую пабудавалі 7000 гадоў таму, знайшлі на дне Міжземнага мора. Яна была схавана пад пластамі марской гразі каля паўднёвага ўзбярэжжа Харватыі, паведамляе Science Alert.**

Гэтая захапляльная знаходка, зробленая на затанулым неалітычным гарадзішчы Салінэ, магчыма, калісьці звязвала старажытнае селішча хварскай культуры з цяпер ізаляваным востравам Корчула. Дагістарычная дарога была абаронена ад магутных хваляў на працягу тысячагоддзяў. Праход шырынёй каля чатырох метраў быў пабудаваны са старанна складзеных каменных пліт.



Даследчыкі лічаць, што хварская культура эпохі неаліту, якая калісьці засяляла ўсходнюю Адрыятыку, пабудавала цяпер затопленае селішча Салінэ і старажытны праход, які злучаў астравы. З дапамогай радыёвугляроднага аналізу захаванай драўніны было ўстаноўлена, што ўсё селішча датуецца прыкладна 4900 г. да н.э.

Нябачная пагроза

# ВОЧЫ НЕБЯСПЕКІ

## У Кітаі адкрылі новы вельмі атрутны від медуз

**Навукоўцы з Ганконгскага ўніверсітэта заявілі аб адкрыцці новага віду марскіх глыбакаводных жывёл. Імі аказаліся вельмі атрутныя медузы. Пра гэта паведамляе The Mirror.**



Даследчыкі выявілі гэты від медуз у запаведніку Мэй По. Жывёлу аднеслі да віду кубамедуз з класа стракальных. Медуза атрымала імя ў адпаведнасці з месцам, дзе яе знайшлі, — Tripedalia maipoensis. Адзначаецца, што гэта першая кубамедуза, выяўленая ў Кітаі.

Асобіны гэтага віду падобныя на кубамедуз, якіх знайшлі на Ямайцы, у Фларыдзе, у Аўстраліі і Індыі. Аднак Tripedalia maipoensis адрозніваюцца малым памерам — усяго каля трох сантыметраў у даўжыню. Акрамя таго, па ўсім невялікім купале ў жывёлы размешчана 24 вокі (разбітыя на чатыры групы па шэсць вачэй), але не ўсе яны здольны перадаваць малюнак, асноўная маса толькі рэагуе на святло.

Важна адзначыць, што кубамедузы вельмі атрутныя. У Аўстраліі для бяспекі людзей уздоўж пляжаў нацягнуты спецыяльныя сеткі, якія абмяжоўваюць перамяшчэнне небяспечных медуз.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

# ЧАЛАВЕК, ЯКІ ГЛЯДЗЕЎ У НЕБА

## На круглым стале, прысвечаным 135-годдзю Язэпа Драздовіча, гаварылі пра мастацтва і пра... космас

*«Вы мяне яшчэ пашукаеце!» Так гаварыў вандроўны мастак Язэп Драздовіч.*

*Сапраўды, чым болей мінае часу — тым болей мы шукаем, разгадваем спадчыну Язэпа Драздовіча, магчыма, самай рамантычнай постаці Беларушчыны. Геній, які ў сваіх візіях падарожнічаў па іншых планетах, стварыў загадкавыя карціны, паэмы і астранамічныя трактаты, не меў свайго кута, жыў з міласціны знаёмцаў і за тое, што распісваў сялянам дыванкі... Памятаеце помнік яму ў Траецкім прадмесці Мінска? Імклівая постаць, доўгія валасы развяваюцца ветрам, барада мудраца, кіёк — ён быў майстар іх выразаць, а над галавой — сусвет фантазій, якія ў яго мелі сапраўды касмічны маштаб.*

*Я — з вечна вандроўных, бяздомных людзей,*
*Што ўласнага куту не маюць,*
*Што не маюць сям'і, ні жон, ні дзяцей,*
*Сіратліва сябе адчуваюць.*

*У мастацкіх колах распавядаюць гісторыю, як дырэктар Луўра, які наведаў наш Нацыянальны мастацкі музей, надоўга затрымаўся менавіта перад карцінамі Язэпа Драздовіча і потым гаварыў, што гэта мастацтва па-за стылямі, жанрамі і часамі...*

*Сёлета Язэпу Нарцысавічу спаўняецца 135 гадоў. У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь з гэтай нагоды адбыўся круглы стол «Космас Язэпа Драздовіча». Ягоная адметнасць у тым, што ўдзельнічалі не толькі мастацтвазнаўцы і архівісты, але і навукоўцы, датычныя да касмічнай тэмы, — фізікі, астраномы, прадстаўнікі тэхнічных навук. Мабыць, упершыню атрымалася магчымасць ацаніць постаць Язэпа Драздовіча ўсебакова — ён жа пісаў не толькі карціны і літаратурныя творы, але і астранамічныя трактаты, маляваў і апісваў іншыя планеты, запэўніваючы, што мае здольнасць іх бачыць... Нават даваў парады наконт палёту ў космас на «шматнабойнай касмічнай тарпедзе, на якой зямныя турысты паляцяць на Месяц».*

*Язэп Драздовіч памёр ад раку ў 1954 годзе ў сельскай бальніцы, самотны, нікому не вядомы... Сёння мы гаворым пра яго як пра беларускага генія, не шкадуючы параўнанняў і эпітэтаў: беларускі Леанарда да Вінчы, Чурлёніс, Цыялкоўскі...*

*Арганізатарамі круглага стала выступілі Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Упраўленне аэракасмічнай дзейнасці апарату НАН Беларусі і Міністэрства культуры. Фонам для гаворкі была адмыслова падрыхтаваная выстава твораў Язэпа Драздовіча з фондаў Акадэміі навук.*



### «ПРАРОК» ЦІ «ПРЫВІД»?

Круглы стол пачаўся з даклада **кіраўніка Упраўлення аэракасмічнай дзейнасці апарату НАН Беларусі, акадэміка НАН Беларусі, доктара тэхнічных навук, прафесара Пятра ВІЦЯЗЯ** на тэму, на якую быў бы шчаслівы пагутарыць Язэп Драздовіч — напрамкі развіцця касмічнай тэматыкі ў нашай краіне. Дакладчык згадаў слынных вучоных родам з Беларусі, якая зрабілі значны ўклад у асваенне космасу, нагадаў, што рыхтуецца да палёту беларуская касманаўтка, распавёў пра сучасныя касмічныя праекты.

**Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі, доктар сакральнай тэалогіі Ірына ДУБЯНЕЦКАЯ** супаставіла творчасць Драздовіча і Чурлёніса, якія абодва пільна ўглядаліся ў народную традыцыю. Менавіта з народнай традыцыі, народнай міфалогіі Драздовіч выходзіў у свае магічныя, астранамічныя візіі, ствараў гістарычныя фантазіі пра беларускую мінуўшчыну.

**Вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Надзея УСАВА** раскрыла таямніцы адной з самых вядомых карцін Драздовіча, якая знаходзіцца ў асноўнай экспазіцыі музея, «Прарок». Карціна трапіла ў музей параўнальна позна, у 1989 годзе. Беларускі кампазітар Яўген Паплаўскі знайшоў яе на гарышчы сваёй бабулі ў вёсцы Поразава ў вельмі пашкоджаным стане, і назву «Прарок» яна атрымала выпадкова, бо аўтар яе не падпісаў, хоць звычайна рабіў на адвароце падрабязныя запісы. Пад гэтай назвай яна і замацавалася ў гісторыі беларускага мастацтва. Магчыма, гэтая карціна была напісана для касцёла ў Поразаве, ксёндз якога даў мастаку прытулак, праўда, наўрад магла выкарыстоўвацца як абраз. Яна адносіцца да містычнай серыі Драздовіча, ад якой захавалася толькі некалькі палотнаў, а ў асноўным адны назвы. Магчыма, гэта карціна «Прывід», якая мелася ў той серыі. Які гэта менавіта прарок? Ці не Даніїл, які прадказаў з'яўленне месіі? У музеі Луцкевіча, з якім супрацоўнічаў Драздовіч, было некалькі асобнікаў кніг Скарыны, магчыма, і кніга прарока Даніїла, а Драздовіч вельмі захапляўся Скарынам. Бесцялесны сілуэт, амаль трансцэндэнтная выява... Але гэты бесцялесны прывід прабівае сцяну бязвер'я, у якой заключаны чалавек, і паказвае яму дарогу да храма, у далёкі іншасветны горад. Надзея Усава параўнала карціну «Прарок» з работамі сусветна вядомых еўрапейскіх мастакоў — «метамарфозамі» Марыўца Эшэра, сюррэалістычнымі карцінамі Рэнэ Магрыта, метафізічным жывапісам Джорджа дэ Кірыко. Драздовіч лічыў, што ўжо ў 1929-м настане эра «беларускага джэнтльмэнства» — прыйдзе новае пакаленне, якое знаходзіцца ў гармоніі з прыродай, эстэтычна адукаванае, ведае зямныя і нябесныя светы, рэлігіяй якога стануць прыгажосць і дабрыня. Калі яго чаканні не спраўдзіліся, пачаў іх увасабляць у вобразах іншапланецян. Што датычыцца карціны «Прарок», перад якой часта спыняюцца наведнікі музея і разгадваюць яе, то Драздовіч, бяздомны, беспрацоўны, стварыў палатно на ўзроўні вядомых эксперыментаў еўрапейскіх мастакоў, новы тып абраза для беларусаў.

### ТЭХНІКА КІРАВАНЫХ СНОЎ

**Старшы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства Жанна ЖЫХАРКА** распавяла, як творчасць Язэпа Драздовіча натхняе сённяшніх творцаў і навукоўцаў. Практычна забытага мастака пачалі адкрываць у 1970-х, прызнаўшы адным з заснавальнікаў беларускай мастацкай школы. Драздовіч заўсёды працаваў на карысць свайго народа. У часы, калі Заходняя Беларусь апынулася ў складзе Польшчы, нават стварыў школу для вясковых дзяцей, дзе выкладанне вялося на беларускай мове, — але яе вельмі хутка зачынілі. Калі выставу беларускага мастацтва запатрабавалі назваць выставай рэгіянальнага мастацтва, бо польскія чыноўнікі лічылі, што беларускага народа няма, рашуча запярэчыў і адмовіўся ад удзелу. А на карцінах ад гэтага часу пачаў дэманстратыўна рабіць надпісы на беларускай мове. Дакладчыца згадала і такія асаблівасці мастака, як тое, што ён валодаў тэхнікай кіраванага, або ўсвядомленага, сну — называў гэта «самнамбулічнымі падарожжамі». Псіхолагам знаёмая такая методыка, яе сёння выкарыстоўваюць для зняцця вострага посттраўматычнага сіндрому. Драздовіч свае сны запісваў і маляваў. Але хоць і называў гэта падарожжамі па іншых планетах, фактычна, заўсёды маляваў Беларусь. У яго творчасці можна заўважыць паралелі з творчасцю нямецкіх экспрэсіяністаў, якія, як і ён, прайшлі Першую сусветную вайну. Толькі калі іх работы — гэта выказванне адзіноты, расчаравання, жаху, у Драздовіча няма безвыходнасці, заўсёды станоўчая энергетыка.

Малюнкі Язэпа Драздовіча — выдатная крыніца для вывучэння народнага касцюма. Гэта сцвердзіла **Марыя ВІННІКАВА, старшы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства.** Яна нават на вачах гледачоў па малюнку Драздовіча зрабіла рэканструкцыю завязвання гарадзейскай намміткі — складанага старажытнага жаночага галаўнога ўбору.

**Наталля ПАЧОБУТ, старшы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук,** распавяла пра яшчэ адзін бок асобы Драздовіча — як археолага, які ўдзельнічаў у раскопках на Замкавай гары ў Навагрудку. Сабраныя і замаляваныя ім экспанаты сведчаць пра ягоную абазнанасць і майстэрства. На экране прысутныя ўбачылі ўнікальныя дакументы: план Навагрудскага замчышча, па-дызайнерску аформленыя Драздовічам аркушы з замалёўкамі знойдзеных артэфактаў.

**Радзівон КОЛАС, малодшы навуковы супрацоўнік Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі,** распавёў пра асабісты архіў Драздовіча з фонду Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа, набыты ў 1965 годзе ў сястры мастака. Адных аркушаў з малюнкамі звыш двухсот пяцідзесяці. Шмат дзённікаў за 1930-я гады. Ёсць працы па астраноміі, якія дасылаліся аўтарам у Акадэмію навук і мала кім чыталіся, бо псеўданавуковага там шмат, але як мастацкія творы чытаць іх цікава. Дарэчы, выявы жыхароў іншых планет, намаляваных Язэпам Драздовічам, цяпер можна ўбачыць на выставе ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы. Шмат што з напісанага Драздовічам яшчэ не выдадзена, і гэта варта выправіць.



Фота Лізаветы ГОПАД.

### ЦІ ЁСЦЬ ЖЫЦЦЁ НА САТУРНЕ?

«А ўсё-ткі ёсць мяйсцы на кружніку Сатурна, дзе ня толькі можыць, але й павінна існаваць нармальнае жыццё, шмат у чым падобнае да нашага зямнога», — пісаў Драздовіч. Ці ёсць нешта праўдзівае ў гэтых «самнамбулічных падарожжах»? **Аляксандр ШЫМБАЛЁЎ, старшы выкладчык кафедры фізікі і методыкі выкладання фізікі фізіка-матэматычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка,** акрэсліў гісторыю пошукаў жыцця ў Сусвеце і выказаў меркаванне, што ўяўленні Драздовіча пра іншыя планеты — гэта ад народнай міфалогіі і фантазіі самога мастака.

**Аляксандр МІКУЛІЧ, загадчык Мінскага планетарыя,** падрыхтаваў прысутным сюрпрыз — кароткаметражны паўнакупальны фільм «Вечны вандроўнік на зорным шляху» студэнткі Акадэміі мастацтваў Надзеі Гіль. Карціны Язэпа Драздовіча дзівосным чынам пераўвасабляюцца, трансфармуюцца, пераносяць у іншыя сусветы. **Канстанцін РАМІШЭЎСКІ, старшы навуковы супрацоўнік Рэспубліканскай лабараторыі культурнай спадчыны Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,** распавёў, як вобраз Драздовіча адлюстраваны ў кінадакументалістыцы. Як прадстаўлена тэма космасу ў Слуцкім краязнаўчым музеі, прысутныя даведаліся ад **дырэктара музея Алены ГУДОВІЧ.** Слуцк — незвычайны горад, дзе нарадзілася шмат людзей, датычных да асваення космасу. Сярод іх — Сямён Косберг, які зрабіў рухавік для трэцяй ступені ракеты, на якой Гагарын здзейсніў свой палёт. І, паводле сведчанняў, Гагарын тады сказаў не проста «Паехалі!», а «Косберг спрацаваў. Паехалі!» У складзе экіпажу «Лунаход-1», тобок каманды, якая кіравала ім з Зямлі, быў случчанін Канстанцін Давідоўскі. Ён распавядаў, як, каб павіншаваць жанчын з 8-м Сакавіка, экіпаж прымусіў лунаход напісаць на месяцовым грунце словы «8 сакавіка». Але энергіі хапіла толькі на лічбу «8», якая і цяпер ёсць на Месяцы. Юныя случчане, што наведваюць музей, даведваюцца шмат і пра сённяшніх беларусаў, якія дапамагаюць асвойваць космас.

Пра ўклад нашай краіны ў асваенне космасу распавёў **Сяргей ВІЦЯЗЬ, намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар гістарычных навук.** А гэта вельмі важны ўнёсак — ад прыладаў траекторных вымярэнняў касмічных аб'ектаў да касмічнага машынабудавання. Так, случчанін Косберг удасканальваў ракету, на якой ляцеў Гагарын, але і разлікі для прызямлення той ракеты рабіліся на Беларусі, у інстытуце фізікі. У 1960-х беларускі акадэмік Салдатаў распрацоўваў асяроддзі, у якіх будзе жыць расліна ў беспаветраных прасторах... На Беларусі прыдумаліся тэрмастойкія матэрыялы, якія прымяняліся ў караблі шматразовага выкарыстання «Буран»... На комплексе, які ляцеў да Венеры, стаяць нашы ахоўныя экраны... Усё не пералічыш.

Безумоўна, з новых пакаленняў беларусаў таксама нехта прысвяціць сябе космасу. **Іларыён ГАЛУЗА, дацэнт кафедры інжынернай фізікі факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, кандыдат педагагічных навук, дацэнт,** распавёў, як ствараюцца сучасныя беларускія падручнікі па астраноміі. Там выкарыстоўваюцца спецыфічныя заданні да малюнкаў, дынамічнае дапаўненне да тэксту. А ў праектах — зварот да этнаастраноміі. Фактычна, тое, што цікавіла Язэпа Драздовіча: астраміфалогія, астрапіктаграфія — вывучэнне старажытных малюнкаў з астранамічным значэннем, астраархеалогія...

Падрабязней пра гэта і ўсё іншае, агучанае на круглым стале, можна ў хуткім часе пачытаць на сайце Акадэміі навук.

Сучаснікі ўспаміналі Язэпа Драздовіча як шляхетнага дзівака, які хадзіў і глядзеў у неба... Сёння мы ўглядаемся ў неба Драздовіча, у якім бясконцая магчымасць адкрыццяў.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# АРЛІНЫ ПОЗІРК СТАРОГА УЛАДА

## Гісторыя вядомага артыста праз архіўныя дакументы

**«У людзей майго пакалення сталеюць ужо ўнукі, маладыя людзі, для якіх дзіўна бывае, калі яны даведваюцца, што чагосьці некалі не было. Ды і не так ужо даўно. Напрыклад, у беларусаў не было сталага тэатра, не было ўніверсітэта, не было... Яны, нашы нашчадкі, шчаслівыя, бо ў іх ёсць, дзе праявіць свой талент і што развіваць далей. Майму ж пакаленню выпала шмат што рабіць упершыню».**

Так пачынае свае ўспаміны «З бурлівых крыніц жыцця» легендарны артыст Уладзімір Уладамірскі. «Стары Улад» — паважліва называлі яго калегі, калі ён быў ужо народным, заснавальнікам цэлай творчай дынастыі.

Сёлета спаўняецца 130 гадоў з дня яго нараджэння. У Беларускім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва адкрылася выстава унікальных дакументаў, якая распавядае пра легендарнага артыста і пра яго сына і ўнука, таксама тэатральных зорак... Давайце зазірнём у фонды музея.

### Над плывучым мостам

І пачнём з аўтабіяграфіі, якая на стэндзе выставы. Уражвае ўжо почырк, буйны, імклівы...

*«Владимирский-Малейко Владимир Иосифович родился 6 октября ст.ст. 1893 года в гор. Ковно. Отец — Иосиф Фёдорович Малейко из крестьян, бывшей Минской губ., Новогрудского уезда, дер. Лысица». Вычеркнуто — «служил десятником плавающего моста на реке Неман в городе Ковно».*

Сын селяніна з Навагрудчыны атрымаў добрую адукацыю: скончыў народную вучэльню, потым — Ковенскую мужчынскую гімназію. Можна пабачыць фотаздымак гімназіста Малейкі (яго сапраўднае прозвішча): тонкі інтэлігентны твар, годная выправа... Позірк, які праз гады назавуць «арліным». Пра ўласцівасці характару выкажацца ў сяброўскім шаржы артыст БДТ-1 Барыс Аляксеенка:

*«Он с первых дней*
*счастливого рождения*
*Доставил маме*
*много огорчения.*
*В забавах детских*
*был неумолим.*
*Игрушкой лучшей —*
*было зеркало и грим».*

Тэатр вабіў з дзяцінства. Але ў лёс умяшалася Першая сусветная вайна. У 1913-м Малейка паступіў вольнаабавязаным у 17-ы стралковы полк горада Сувалкі, такім чынам, з першых дзён вайны — фронт. У баях ва Усходняй Прусіі быў кантужаны, узяты ў палон і адпраўлены ў лагер ваеннапалонных у горад Стэндаль. Прабыў там ажно да 1919-га. Ці ратаваў сябе ў палоне? Гэта ўдакладніць вось гэты ліст да артыста Уладамірскага: *«Мы, бывшие военнопленные в Германии, члены драматического кружка в лагере гор. Стендаль провинции Саксонии, ныне проживающие в Москве, горячо поздравляем с шестидесятилетием твоего жизненного пути и тридцатипятилетием артистической деятельности на сцене Государственного драматического театра родной Белоруссии».*

Так што і ў палоне Малейка працягваў жыць тэатрам.



Тры разы спрабаваў збегчы, на трэці раз — паспяхова.

### Джыгітоўка з кавалерыстамі

Далей чытаем аўтабіяграфію: *«Возвратившись из плена, прибыл в Бобруйск, где в то время проживали мои родители — беженцы из г. Ковно... Поступил добровольцем в Конармию в отдельный запасной батальон... В 1920-м году при организации гарнизонного театра я был зачислен в состав труппы актером театра, который в 1921-м году был переформирован во 2-й Красноармейский показательный театр Политуправления реввоенсовета Западного фронта с базой в городе Бобруйске...»*

Пра гэты перыяд распавядуць успаміны палкоўніка запасу Уладзіміра Глазырына «Артыст, выхаваны Чырвонай Арміяй»:

*«1919 год. Фронт 16-й Красной армии... Деревни и местечки вдоль реки Березины. Здесь находился Второй показательный театр Красной армии, закрепивший свою базу в городе Бобруйске после занятия его Красной армией. Вспоминается актер этого славного театра — молодой, подвижный блондин, в серой студенческой куртке, с залихватски зачесанными волосами. Энергия и подвижность выделяли его из общей среды, кроме того, он был очень остроумен...*

*Однажды шел спектакль в расположении кавалеристов. Актер Владимирский, сыграв свою роль, был уже среди бойцов. Сбросив студенческий пиджак, он показывал бойцам-кавалеристам свое мастерство джигитовки, прибавляя к «ножницам» чисто акробатические номера. Бойцы смотрели и удивлялись: «Ишь ты, актер, а ездит не хуже нас».*

Пабываў Уладамірскі тады і ў складзе перасоўных франтавых тэатраў:

*«Из старых досок сбили эстраду на скорую руку, зажгли керосиновые лампы... Владимирский читал стихи «Павшим в боях с белопольскими оккупантами». Этот торжественный момент прервали звуки сигнальной трубы — труба объявила тревогу и повелительно звала в строй, к бою!.. Артисты на равных участвовали в боях с врагом в рядах бойцов пулеметного эскадрона».*

### Сцэна пачалася з... малпы

А потым новая эпоха ў жыцці Уладамірскага — ён увайшоў у трупу БДТ-1, будучага Купалаўскага тэатра. Прыехаў у Мінск, угаварыў рэжысёра Еўсцігнея Міровіча даць яму спробу ў спектаклі, уразіў...

Праўда, чытала і іншую версію. Працуючы ў гарнізонным тэатры, Малейка пазнаёміўся з будучай жонкай, Кацярынай Замешынай, актрысай, танцоўшчыцай, з дваранскай сям'і Азбукіных. Да рэвалюцыі яна выкладала ў адной з бабруйскіх жаночых гімназій. Яе першы муж Замешын знік падчас Грамадзянскай вайны. У 1921-м Уладзімір і Кацярына ўжо як сямейная пара ігралі ў Смольным тэатры ў Петраградзе. Але праз год, калі Кацярына зацяжарала, вярнуліся ў Бабруйск. У 1924-м пасля гастроляў Бабруйскага тэатра ў Мінску Кацярыну Васільеўну запрасілі ў трупу БДТ-1. Але яна паставіла ўмову — разам з ёй прымуць і яе мужа. Мужчынскіх вакансій не было, Уладамірскага, які выдатна валодаў пластыкай, узялі ў балетную трупу. Але ў спектаклі пра стралка Тыля ён так выдатна сыграў... малпу, што глядач ішоў адмыслова на яго. А праз год Міровіч спецыяльна для Уладамірскага падбіраў ролі.

Гэты тэатр стаў лёсам. *«Па праўдзе, ні адзін дзень у нас не быў змарнаваны, мы тады не ведалі стомы і вучыліся, здаецца, усюды і ў кожнага. Маладыя — у старэйшых таварышаў, на ўроках па фехтаванні, «па голасе», чыталі пра тэатр усё, што толькі было ў бібліятэках Мінска; слухалі і глядзелі ўсіх гастралёраў. На кірмашах і ў касцёлах, на вакзале і ў сяброўскай гутарцы мы ўглядаліся ў «тыпы» і ў «твары», прыслухоўваліся да гаворкі дзядзькі са Слуцка і чыгуначніка з Серабранкі, рамізніка з Залатой горкі і харыста царкоўнага хору...»*

Уладзімір Уладамірскі славіўся надзвычай пільнай працай над ролямі. Цэлы сшытак ён прысвяціў працы над роллю Леапольда Гушкі з п'есы Кузьмы Чорнага «Бацькаўшчына». *«Зноў — да люстэрка. Думаю, думаю пра Леапольда, а сам прымяраю вусы розныя, бровы, з гумоза насы раблю. Сам не ведаю — чаму, але аднойчы, прамовіўшы ўголас рэпліку Гушкі: «Хоць у вір галавой кідайся! А чалавек хіба на тое родзіцца на свет, каб у вір галавой кідацца? Чалавек родзіцца, каб жыць...» — я сам адчуў, што ў яго павінны быць густыя бровы над самымі вачыма, у якіх гарыць вось гэтая думка («Каб жыць!»), і што нібы хавае ён свой позірк «пад брывямі».*

### «Разыскиваю свою семью из г. Минска...»

Прыйшло прызнанне. Уладзімір Уладамірскі ў 1938-м стаў народным артыстам БССР. Здавалася, усё спрыяльна. Але ў 1930-м арыштоўваюць брата Кацярыны Васільеўны, Мікалая Азбукіна, вядомага беларускага дзеяча і навукоўца. Арыштавалі і яе бацьку. Абодва з высылкі не вярнуліся. Магчыма, пасля гэтага Кацярына Васільеўна сышла з БДТ-1. Вядома, што ў 1936-м яна кіравала самадзейным лялечным тэатрам пры Палацы піянераў і школьнікаў у Мінску.

А потым пачалася вайна.

Беларускі дзяржаўны тэатр вайна застала на гастролях у Адэсе. Тагачасная дырэктарка Фані Алер дамаглася дазволу на ад'езд трупы ў Маскву, адтуль тэатр эвакуіравалі спачатку ў Новасібірск, затым — у Томск. Людзі былі апранутыя лёгка, па-летняму, не мелі з сабой рэчаў... Не кажучы пра тое, што давялося пакінуць дэкарацыі, касцюмы.

Але самае страшнае — разлука з сем'ямі. Уладамірскі нічога не ведаў пра лёс сваёй Каці і сына Барыса. У асабістым фондзе спявачкі Ларысы Александроўскай захоўваецца некалькі лістоў Уладамірскага, у тым ліку паштоўка, адпраўленая 23.07.1941 года ў Алма-Ату, у Камітэт садзейнічання бежанцам:

*«Дорогие товарищи! Разыскиваю свою семью из г. Минска. Сын — Борис Владимирович Владомирский-Малейко, студент театрального уч-ща, и мою жену артистку Екатерину Васильевну Замешину-Малейко. Я здоров. Выезжаю коллективом 1-го Белгосдрамтеатра в гор. Новосибирск. Куда и прошу сообщить до востребования на имя народного артиста БССР-орденоносца Владимира Иосифовича Владомирского или родным».*

Тое ж ён піша і Александроўскай:

*«Здравствуйте, дорогая Лариса Помпеевна!*

*Узнав, что Вы в Алма-Ате, спешу сказать Вам пару слов о себе и нашем коллективе... Устроились в актерских общежитиях неплохо, но у меня горе — потерял семью. Прошу Вас, дорогая Лариса Помпеевна, если вы что-либо знаете или узнаете о моих близких и дорогих мне, напишите мне по адресу: гор. Томск, Гортеатр... Пишу запросы во многие пункты и пока безрезультатно. Тяжело одному.»*

